Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

58 (7384)
ПЯТНІЦА
30
сакавіка 1945 г.

Цана 20 кап.

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 3-га Украінскага фронта
Маршалу Совецкага Саюза ТАЛБУХІНУ
Начальніку штаба фронта
Генерал-лейтэнанту ІВАНОВУ

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, у выніку імклівага наступлення, сёння, 29 сакавіка, авалодалі гарадамі і важкымі вузламі дарог СОМБАТЭЛЬ, КАПУВАР і, заняўшы горад КЕСЕГ, выйшлі на аўстрыйскую граніцу.

У баях за авалоданне гарадамі СОМБАТЭЛЬ, КАПУВАР і КЕСЕГ вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ГЛАГОЛЕВА, генерал-лейтэнанта ЗАХВАТАЕВА, генерал-маёра РАЖДЗЕСТВЕНСКАГА, генерал-маёра ДЗЕРЗВЯНКА, генерал-лейтэнанта ТІХАНАВА, генерал-лейтэнанта МІРОНАВА, генерал-маёра БАБРУКА, генерал-маёра БАГДАНАВА, генерал-маёра БЛАЖЭВІЧА, палкоўніка ЛАРЫНА, палкоўніка СЦЕПАНАВА, палкоўніка ПАРФЕНАВА, палкоўніка БРАНСБУРГА; артылерысты генерал-палкоўніка артылерыі НЕДЗЕЛІНА, генерал-маёра артылерыі БРЭЖНЕВА, генерал-маёра артылерыі ГУСЕВА, генерал-маёра артылерыі ЦЫКАЛО, генерал-маёра артылерыі БЕЛІКАЛЕПАВА, генерал-маёра артылерыі РАТАВА, палкоўніка БУЛАХЦІНА, палкоўніка ВАЛЧАНЕЦКАГА, палкоўніка ГІЛЬМАНА, палкоўніка ЧАПЛІНА, палкоўніка БАЖЭНАВА, палкоўніка СЦЕПАНАВА, падпалкоўніка ЖЭВУЦКАГА, маёра ШАБАЛІНА; танкісты генерал-палкоўніка танкавых войск КРАЎЧЭНКА, генерал-маёра танкавых войск ПАВЕЛКІНА, генерал-лейтэнанта танкавых войск ВОЛКАВА, генерал-лейтэнанта РУСІЯНАВА, генерал-маёра танкавых войск ШТРОМБЕРГА, генерал-маёра танкавых войск САВЕЛЬЕВА, палкоўніка БУДНІКАВА, палкоўніка АСТАПЕНКА, палкоўніка БЕЛАГЛАЗАВА, палкоўніка ЖЫЛІНА, палкоўніка МІХНО, палкоўніка СЕЛЕЗНЁВА, палкоўніка ОБДАЛЕНКАВА, падпалкоўніка ШАЛЫГІНА, падпалкоўніка САРАЧЫНСКАГА, падпалкоўніка АЎЧАРАВА, палкоўніка БОРАНАВА, падпалкоўніка САВЕЛЬЕВА, маёра ПЛОТНІКАВА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі СУДЗЕЦ, генерал-лейтэнанта авіяцыі ТОЛСЦІКАВА, палкоўніка ІВАНОВА, палкоўніка ТЕРЭХАВА, палкоўніка СМІРНОВА, палкоўніка НЕДАСЕКІНА, падпалкоўніка ШАЦІЛІНА, падпалкоўніка КАЖЭУНІКАВА; сапёры генерал-палкоўніка інжынерных войск КОТЛЯРА, палкоўніка ВАДАВАТАВА, палкоўніка ФАДЗЕЕВА; сувязісты генерал-лейтэнанта войск сувязі КАРАЛЁВА, палкоўніка МЯЧЫНА, палкоўніка ШЭРВУДА, падпалкоўніка СУХІХ.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне гарадамі СОМБАТЭЛЬ, КАПУВАР і КЕСЕГ, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 29 сакавіка, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 3-га Украінскага фронта, якія авалодалі названымі гарадамі, — дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за авалоданне пайменаванымі гарадамі.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

29 сакавіка 1945 года
№ 316

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 3-га Беларускага фронта
Маршалу Совецкага Саюза ВАСІЛЕЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта
Генерал-палкоўніку ПАКРОЎСКАМУ

Войскі 3-га БЕЛАРУСКАГА фронта сёння, 29 сакавіка, завяршылі ліквідацыю акружанай усходне-пруская групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА.

За час баёў з 13 па 29 сакавіка немцы страцілі звыш 50.000 палоннымі і 80.000 забітымі, пры гэтым войскі фронта захапілі 605 танкаў і самаходных гармат і звыш 3.500 палявых гармат.

У баях пры разгроме групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта ЛУЧЫНСКАГА, генерал-палкоўніка ГАРБАТАВА, генерал-лейтэнанта ШАФРАНАВА, генерал-палкоўніка ГАЛІЦКАГА, генерал-палкоўніка КРЫЛОВА, генерал-лейтэнанта ЧАНЧЫБАДЗЕ, генерал-лейтэнанта ГУСЕВА, генерал-лейтэнанта ІВАШЭЧКІНА, генерал-лейтэнанта СЕМЁНАВА, генерал-лейтэнанта ГЛЕБАВА, генерал-маёра РАГАЧЭЎСКАГА, генерал-маёра ШЧЭДРЫНА, генерал-маёра ПРЫХІДЗЬКА, генерал-маёра ЛЕВІНА, генерал-лейтэнанта ІВАНОВА, генерал-лейтэнанта КУЗНЕЦОВА, генерал-лейтэнанта УРБАНОВІЧА, генерал-лейтэнанта КАШЭВОГА, генерал-лейтэнанта ФАКАНАВА, генерал-лейтэнанта КАЛГАНАВА, генерал-маёра АЛЕКСАНДРАВА, генерал-маёра ШВАРЭВА, генерал-маёра БАЦІЦКАГА, генерал-маёра НІКІЦІНА, генерал-маёра КНЯЗЬКОВА, генерал-маёра КЛЕШНІНА, генерал-маёра ІВАНОВА, генерал-маёра ПЕРЭКРЭСТАВА, генерал-маёра КАЗАРЦАВА, генерал-маёра ПРАВАЛАВА, генерал-маёра АРУШАНЯНА, генерал-маёра ЛЮХЦІКАВА, генерал-маёра ГАРЦЭВА, генерал-маёра ВЛАДЫЧАНСКАГА, генерал-маёра ДАНІЛАВА, генерал-маёра КУЗНЕЦОВА, генерал-маёра МЫШКІНА, генерал-маёра КОРЧЫКАВА, генерал-маёра ТУРЧЫНСКАГА, палкоўніка ШАЦКАГА, палкоўніка ПАПОВА, палкоўніка РЫБАЛКО, генерал-маёра ХВАСТОВА, генерал-маёра МАЛЮКОВА, палкоўніка ЦВЕТКОВА, генерал-маёра МІХАЛІЦЫНА, палкоўніка ТЕЛКОВА, палкоўніка РАМАНЕНКА, генерал-маёра ВЕРОЎКІНА, палкоўніка АБІЛАВА, палкоўніка КРЫВЕНЦОВА, генерал-маёра КАНАВАЛАВА, палкоўніка ВЯЗНІКОЎЦАВА, палкоўніка ГРЭКАВА, палкоўніка ЛЕВІНА, генерал-маёра БЕРЭСТОВА, палкоўніка БУЛАНАВА, палкоўніка ДЗЁМІНА, палкоўніка ХАУСТОВІЧА, генерал-маёра САМАХВАЛАВА, генерал-маёра ПРОНІНА, генерал-маёра КАРЫЖСКАГА, генерал-маёра МАСЛАВА, палкоўніка ТОЛСЦІКАВА, генерал-маёра КАЗАРАНА, палкоўніка ЦУКАРЭВА, палкоўніка КУСАКІНА, генерал-маёра ГАРАДАВІКОВА, палкоўніка ЛОГІНАВА, генерал-маёра ДОНЕЦ, палкоўніка ЗОРЫНА, генерал-маёра МАКСУТАВА, палкоўніка КАЦЮШЫНА, палкоўніка ЗАЛАТАРОВА, генерал-маёра МАКСІМОВІЧА, палкоўніка ПОЛІШЧУКА, генерал-маёра ЗАКУРЭНКАВА, палкоўніка ВОЛКАВА, генерал-маёра МАСКАЛЕНКА, палкоўніка БІРСТЭЙНА, палкоўніка ПАШКОВА, палкоўніка ГРЫГОРАНА, палкоўніка ПАГРЭБНЯКА, палкоўніка СЕРАБРОВА, палкоўніка ЦЫПЛЕНКАВА, генерал-маёра КАЗАКЕВІЧА, палкоўніка ГРЭБНЁВА, генерал-маёра БУЛАТАВА, генерал-маёра ОПЯКІНА, палкоўніка СОБАЛЕВА, генерал-лейтэнанта ЛЮБЫЙ; артылерысты генерал-палкоўніка артылерыі БАРСУКОВА, генерал-маёра артылерыі ПЕТРАПАУЛАУСКАГА, генерал-маёра артылерыі ВЛАДЗІМІРАВА, генерал-маёра артылерыі СЁМІНА, генерал-лейтэнанта артылерыі СЕМЁНАВА, генерал-маёра артылерыі ФЁДАРАВА, генерал-лейтэнанта артылерыі СТРЭЛЬБІЦКАГА, генерал-лейтэнанта артылерыі ТІМАЦІЕВІЧА, генерал-лейтэнанта артылерыі САЛІЧКА, генерал-маёра артылерыі ПАПОВА, палкоўніка КУЗНЕЦОВА, палкоўніка СТРУЕВА, генерал-маёра артылерыі КОРАЧКІНА, генерал-маёра артылерыі КАРСАНАВА, палкоўніка СЕДОВА, палкоўніка МАРГУЛІСА, палкоўніка ЗАСЕКІНА, палкоўніка КІЛЕЕВА, палкоўніка МЕРКУР'ЕВА; танкісты генерал-палкоўніка танкавых войск РОДЗІНА, палкоўніка БАБЕНКА, палкоўніка ОПАРЫНА, палкоўніка ЛУКАШОВА, палкоўніка ПРАКАПЕЦ, палкоўніка СЕМЕНЮКА, палкоўніка ГАЛАЎЧАНСКАГА, генерал-маёра танкавых войск НОСАВА, палкоўніка ІВАНЦОВА, палкоўніка БЕЛІКА, падпалкоўніка СУРНІНА, палкоўніка КОЗІКАВА; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі ХРУКІНА, генерал-палкоўніка авіяцыі ПАПІВІНА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ДАГАЕВА, генерал-маёра авіяцыі БЕЛОВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ТУПІКАВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі НЕСЦЕРЦАВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ЛОГІНАВА, палкоўніка СКОКА, генерал-маёра авіяцыі ІВАНОВА, палкоўніка ПРУТКОВА, палкоўніка ХАТМІНСКАГА, генерал-маёра авіяцыі ШЭЎЧЭНКА, палкоўніка ЧУЧЭВА, генерал-маёра авіяцыі НЕЧЫПАРЭНКА, генерал-маёра авіяцыі ЗАХАРАВА, палкоўніка ЗІМІНА, палкоўніка ШЫНКАРЭНКА, палкоўніка АНДРЭЕВА, падпалкоўніка ЗАКЛЕПА, падпалкоўніка САЖНЕВА, генерал-маёра авіяцыі МОЛАКАВА, палкоўніка ЛЕБЕДЗЕВА, генерал-маёра авіяцыі АЛЕКСАНДРАВА, палкоўніка КУЧМА, генерал-маёра авіяцыі АНДРЭЕВА, палкоўніка КУРБАТАВА, маёра ДЗЕЛЬФІНА, палкоўніка ПЛАХАВА, падпалкоўніка РОДЗІНА, палкоўніка БЕЛЫЙ; сапёры генерал-лейтэнанта інжынерных войск БАРАНАВА, палкоўніка ШЫЛО, палкоўніка ЖЭЛЕЗНЫХ, палкоўніка ЛУКАШЭНКА; сувязісты генерал-лейтэнанта войск сувязі БУРАВА, генерал-маёра войск сувязі МІШЫНА, палкоўніка ПЛОТКІНА, палкоўніка БЕЛЫШОВА, палкоўніка ДАВЫДЗЕНКА, палкоўніка ПРЫХОДАЙ, генерал-маёра войск сувязі КОКОРЫНА, генерал-маёра войск сувязі МАМОТКО, падпалкоўніка ЦЫЛБОВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях пры разгроме групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 29 сакавіка, у 23 гадзіны сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 3-га Беларускага фронта, якія разграмілі ўсходне-пруская групу нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА,— дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях пры разгроме ўсходне-пруская групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН

29 сакавіка 1945 г.
№ 317.

Да прадстаячай канферэнцыі Аб'еднаных Нацый у Сан-Францыска

У адпаведнасці з рашэннем Крымскай канферэнцыі, 25 красавіка ў Сан-Францыска адкрываецца Канферэнцыя Аб'еднаных Нацый для выпрацоўкі статута ўстаўляемай міжнароднай арганізацыі для захавання міру і бяспекі.

Для ўдзелу ў гэтай канферэнцыі Совет Народных Камісараў Саюза ССР назначыў Дэлегацыю ў наступным саставе: Грамыка А. А.—совецкі Пасол у ЗША, Старшыня Дэлегацыі, пасланнік Собалеў А. А., пасланнік Новікаў К. В., пасланнік Царапкін С. К., генерал-лейтэнант Васільеў А. Ф., контр-адмірал Радзіёнаў К. К., прафесар Галунскі С. А., прафесар Крылоў С. Б.

(ТАСС).

Арганізуем усесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 года

Узорна правядзем веснавую сяўбу!

Зварот

КАЛГАСНІКАЎ І КАЛГАСНІЦ СЕЛЬГАСАРЦЕЛІ ІМЕНІ ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАН, БРУХАВЕЦКАГА РАЁНА, КРАСНАДАРСКАГА КРАЯ, ДА ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ І КАЛГАСНІЦ, ТРАКТАРЫСТАЎ І ТРАКТАРЫСТАК, АГРАНОМАЎ, МЕХАНІКАЎ І ІНЖЫНЕРАЎ, ДА ЎСІХ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ СОВЕЦКАГА САЮЗА

Дарагія таварышы!

З Кубанскай станіцы, вызваленай ад нямецкіх захопнікаў, пішам мы гэтае пісьмо ў дні, калі па ўсёй совецкай зямлі пабеднымі залпамі маскоўскіх салютаў грыміць слава вялікай Чырвонай Арміі—вызваліцельніцы. На варожай зямлі, па подступах да Берліна б'юць фашысцкага звера нашы сыны, бацькі і браты. Канчатковая перамога цяпер блізка.

Таварыш Сталін высока ацаніў самаадданую працу калгаснага сялянства ў дні Айчыннай вайны. Разам з усімі калгаснікамі і калгасніцамі краіны мы ганарымся гэтай высокай ацэнкай і абяцаем яшчэ больш узмацніць дапамогу Чырвонай Арміі.

Пасля вызвалення роднага краю ад нямецкіх разбойнікаў у нашым калгасе адноўлены: малочна-таварная, аўцагадоўчая, свінагадоўчая, конегадоўчая фермы і пасека, якія былі разбураны немцамі. Дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі на 1944 год выкапан: па буйнай рагатай жывёле на 136 процантаў, па свінях—на 103 процанты, па авечках—на 107 процантаў, па конях—на 103 процанты.

У мінулым годзе мы вырасцілі і ўбралі добры ўраджай. Азімай пшаніцы з 523 гектараў мы сабралі па 15,7 цэнтнера з гектара, ячменю яравога з 672 гектараў — па 13 цэнтнераў, кукурузы з 328 гектараў па 25 цэнтнераў, сланечніка з 295 гектараў — па 12 цэнтнераў. Перавыкананы планы ўраджайнасці па плешчавіне, просу, бульбе і гародніне.

Наш калгас перавыканаў план абавязковых паставак сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве. У 1944 годзе намі здадзена: збожжа 57.388 пудоў па плану і, звыш таго, 41.960 пудоў у фонд Чырвонай Арміі; сланечніку здана 9.211 пудоў па плану і 871 пуд звыш плана ў фонд Чырвонай Арміі; малака здана 23,3 тысячы літраў — па 3.000 літраў больш плана; мяса здана 50 цэнтнераў, замест 30; воўны—244 кілограмы замест 239 кілограмаў. Калгаснікі атрымалі на кожны працадзень па 2,5 кілограма збожжа і па 3 р. 60 кап. грашыма.

Сабраўшыся напярэдадні веснавой сяўбы, мы абмеркавалі пастанову Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год. Яна ўказвае нам шлях барацьбы за далейшы рост і ўмацаванне калгаснай гаспадаркі. «Усямернае павышэнне ўраджайнасці і павелічэнне валавых збораў збожжа і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў»—вось галоўная задача, пастаўленая перад намі партыяй і ўрадам.

Мы звяртаемся да Вас, дарагія таварышы, з заклікам арганізаваць соцыялістычнае спаборніцтва ўсіх калгасаў, МТС, паляводчых і трактарных брыгад, звеняў, усіх калгаснікаў і калгасніц, аграномаў і механікаў, інжынераў МТС за выдатнае правядзенне веснавой сяўбы, за высокі ўраджай ў 1945 годзе.

Мы абавязваемся:

Поўнасцю аднавіць пасеўную плошчу калгаса, расшырыць пасеў супроць 1944 года на 199 гектараў.

Атрымаць у 1945 годзе на ўсёй плошчы збожжавых культур па 120 пудоў з гектара.

Перавыканаць план па ўраджайнасці ўсіх іншых культур.

Для выканання гэтай задачы мы рашылі:

1. Правесці сяўбу толькі гатунковым насеннем першакласных пасеўных кандыцый. Калгас насеннем забяспечан поўнасцю. Усё яно праверана кантрольна-насеннай лабараторыяй і прызнана добраякасным.

2. Усе веснавыя работы правесці так, як гэтага патрабуе перадавая агратэхніка: пасеяць кожную культуру па лепшых папярэдніках, строга захоўваючы севазварот, берагчы вільгаць на палях. Адразу, як толькі на ворыве падсохнуць грэбні, забаранаваць усё зябліва, а перад сяўбой пракультывіраваць, веснавое ворыва закончыць у самыя раннія тэрміны. Сяўбу каласавых культур правесці ў 8 дзён, а прапашныя пасеяць у 6 дзён, у лепшыя для кожнай культуры тэрміны.

Адборным гатунковым насеннем, на лепшых глебах і ў сціслыя тэрміны (тры дні) засеяць насенныя ўчасткі. Гэтыя ўчасткі мы замацавалі за звеннямі.

3. Арганізаваць добрае абслугоўванне трактарных брыгад, каб машыны не прастойвалі. Мы ўжо выдзелілі сталых прыцэпшчыкаў, возчыкаў гаручага, арганізавалі харчаванне для трактарыстаў, адрамантавалі брыгадныя станы, зрабілі падвалы для захоўвання гаручага і завезлі гаручае ў брыгады.

4. З поўнай нагрузкай выкарыстаць жывое цягло. За тры тыдні да пачатку палявых работ мы паставілі коней і валоў на ўзмоцнены адкорм і адпачынак, каб яны маглі прадукцыйна працаваць у гарачыя дні сяўбы. Мы забраніравалі для рабочай жывёлы 400 цэнтнераў сена і 120 цэнтнераў канцэнтратаў. Для догляду коней і валоў выдзелены вопытныя калгаснікі, на кожнага каня і вала падрыхтавана збруя.

5. Правільна арганізаваць працу на веснавых палявых работах. Умацаваць састаў брыгад і звеняў, не дапускаць абязлічкі ў выкарыстанні зямель, рабочай жывёлы, інвентару. Моцнай прапоўнай дысцыплінай, укараненнем індывідуальнай і групавой здзельшчыны, разгортваннем соцыялістычнага спаборніцтва паміж брыгадамі, звеннямі і паасобнымі калгаснікамі дабіцца высокай прадукцыйнасці працы, выканання і перавыканання норм выпрацоўкі.

6. Забяспечыць жывёлу кармамі. Пасеяць прыфермскі ўчастак у 95 гектараў, у тым ліку 55 гектараў аднагадовымі травамі, 10 гектараў—кораньплодамі, 15 гектараў—сіласнымі культурамі і 15 гектараў—кукурузай.

Наш калгас у поўнай гатоўнасці сустракае веснавую сяўбу. Гэтымі днямі калгаснікі суседняй арцелі «Чырвоны Таманец» правялі ў нашым калгасе дэталёвую гаспадарчую праверку гатоўнасці да выхаду ў поле. Калгас імені Чырвоных партызан вытрымаў гэтую праверку — падрыхтаваўся да сяўбы выдатна.

Таварышы калгаснікі і калгасніцы! Уключайцеся ў соцыялістычнае спаборніцтва за выдатнае правядзенне сяўбы ў сціслыя тэрміны, за высокі ўраджай 1945 года.

Таварышы трактарысты, механікі і інжынеры МТС! З першага дня вясны дайце поўную нагрузку трактарам, дабіцеся лепшага скарыстання трактарнага парка, павысьце якасць трактарных работ, выканайце ў лепшыя агратэхнічныя тэрміны свае вытворчыя абавязацельствы перад калгасам, правядзіце сяўбу так, каб калгаснікі маглі Вам ад душы сказаць дзякуй!

Таварышы аграномы! Калгаснікі чакаюць ад Вас сталага кіраўніцтва, парады і дапамогі, каб з чэсцю выканаць свае абавязацельствы. Дапамажыце нам правесці палявыя работы па ўсіх правілах высокай агратэхнікі, дапамажыце чотка арганізаваць працу ў паляводчых і трактарных брыгадах!

Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва ў калгаснай вёсцы! Узорна правядзем чацвертую ваенную вясну, вырасцім у 1945 годзе высокі ўраджай!

Няхай жыве наша магутная совецкая Радзіма!

Няхай жыве наша доблесная Чырвоная Армія — армія-вызваліцельніца!

Няхай жыве вялікі палкаводзец, правадыр, настаўнік і друг калгаснага сялянства таварыш Сталін!

Смерць нямецкім захопнікам!

Старшыня арцелі МАМАНТАЎ С. М.; члены праўлення: ЛЕВЕНКА А. Е., ІЛЬЧЭНКА І. І., ШЫЎЧЭНКА А. М., БЫЧЭК Г. К., аграном арцелі: КАМНЕЎ Ф. С.; брыгадзіры: КРАСНІЦКІ М. М., КАЛОДЗЬКА А. В.; звенняявыя: ЛАНЦОВА Д. А., БАБАНІНА А. І., ЛЕВЕНКА К. А., БУРАНАВА Т. П.; сакратар комсамольскай арганізацыі ГЛУШТАР П. М.; брыгадзір трактарнай брыгады ПАДГОРНЫ П. А.; трактарысты: БЫЧЭК М. В., ІСАЙКА В. Г.; прыцэпшчык КАРАЛЕЎ В. Ф.; загадчык МТФ КАЛОДЗЬКА М. В.; брыгадзір СТФ КУЗЕМЧЭНКА О. Ф.; калгаснікі і калгасніцы: СЛІПЕНКА У. Е., КАРАНДЗЮК М. І., АЛЕЙНІК Б. М., ГУБСКАЯ Р. К., ЛІЗЕНКА Р. М., ХРЭБТАВА А. В., САВА І. К.

САЛЮТЫ МАСКВЫ 28 САКАВІКА

Учора народы Совецкага Саюза з радасцю даведаліся пра новыя бліскучыя перамогі совецкіх войск—пра іх выхад на аўстрыйскую граніцу і пра ліквідацыю ўсходне - пруская групіроўкі немцаў. Так закончыўся чарговы баявы дзень совецкіх армій, наступаючых на тэрыторыі ненавіснай гітлераўскай Германіі.

Учарашняму дню папярэднічаў не менш баявы дзень — 28 сакавіка.

У гэты дзень сталіца нашай Радзімы Масква тройчы салютавала доблесным войскам Чырвонай Арміі. Шесцьдзесят артылерыйскіх залпаў з двухсот дваццаці чатырох гармат праплылі над Масквой, абуджаючы цішыню; тысячы рознакаляровых ракет асвяцілі перадвясенняе неба Масквы.

Знамянальных перамог дабіліся совецкія воіны ў гэты дзень.

Войскі 2-га Беларускага фронта 28 сакавіка штурмам авалодалі горадам Гдыня—важнай ваенна-марской базай і буйным портам на Балтыйскім моры. У баях за Гдыню войскі фронта ўзялі ў палон да 9 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў, захапілі многа ўзбраення і рознай ваеннай маёмасці.

Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталін загадаў злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне горадам і ваенна-марской базай Гдыня, прадставіць да прысвоєння найменавання «Гдыньскіх» і да ўзнагароджання ордэнамі.

Другі салют прагучэў у чэсць войск 3-га Украінскага фронта, якія, развіваючы наступленне, фарсіравалі раку Раба і авалодалі гарадамі Чорно і Шарвар—важнымі вузламі чыгунак і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў, якія прыкрывалі шляхі да граніц Аўстрыі.

Гэта было 28 сакавіка. А 29 сакавіка нашы войскі ўжо выйшлі на аўстрыйскую граніцу.

Войскам 2-га Украінскага фронта быў прысвечан трэці маскоўскі салют. Прадаўжаючы наступленне па паўднёваму берагу Дуная, войскі названага фронта 28 сакавіка авалодалі гарадамі Дзьер і Комаром — важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на Венскім напрамку.

Вялікая наша Радзіма славіць доблесных сваіх воінаў, што ў жорсткіх баях здабываюць жаданую перамогу над ненавісным ворагам. Яна славіць іх кожны дзень. І кожны дзень набліжае канчатковы разгром гітлераўскай Германіі, дзень таржаства нашай справядлівай справы.

Нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі Мінскай вобласці

28 і 29 сакавіка ў Мінску адбывалася абласная нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі. У рабоце нарады прынялі ўдзел стаханаўцы калгасных палёў, трактарысты, звенняявыя, брыгадзіры, старшыні калгасаў, дырэктары МТС, аграномы, кіраўнікі совецкіх і партыйных арганізацый.

З дакладам аб падрыхтоўцы і правядзенні веснавой сяўбы ў калгасах вобласці выступіў сакратар Мінскага абкома КП(б)Б тав. Нікіцін.

Дакладчык падрабязна спыніўся на практычным ажыццяўленні пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) і пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год. Тав. Нікіцін расказаў аб тых задачах, якія стаяць перад кожным калгасам, соўгасам і МТС, перад кожным партыйным, совецкім і зямельным работнікам у справе паспяховага завяршэння падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы.

Значную частку свайго даклада тав. Нікіцін прысвяціў пытанням палепшання работы МТС, расшырэння радоў трактарыстаў—пяцісотнікаў, васьмісотнікаў і тысячнікаў, пытанням арганізацыі працы ў брыгадах і звеннях, своечасовага разгортвання палявых работ і выканання правіл агратэхнікі.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

— Маё звяно,—заявіла звенняявая калгаса імені Калініна, Дзержынскага раёна, тав. Бернатовіч,—змагаецца за атрыманне з кожнага гектара па 18,5 цэнтнера збожжа замест 8,5 цэнтнера па плану. Каб выканаць свае абавязацельства, мы падрыхтавалі да сяўбы высокаякаснае насенне, вывезлі ў поле 188 тон торфу і 360 тон гною, сабралі 41 цэнтнер птушынага памёту і попелу. Гэта будзе зарукай таму, што 18 цэнтнераў збожжа з гектара мы атрымаем.

Тав. Баркун—старшыня перадавога ў Мінскім раёне Каралішчавіцкага сельсовета падзяліўся вопытам работы перадавых калгасаў «Усход» і «Большэвік».

Вольга Бачыла—звенняявая калгаса імені Фрунзе, Рудзенскага раёна, расказала нарадзе пра сваю работу па падрыхтоўцы да сяўбы і ўздыму ўраджайнасці яравых культур.

— Аграномы нашай вобласці, — сказаў у сваім выступленні начальнік Мінскага абласнога зямельнага аддзела тав. Лапша, — часта замест канкрэтнай справы і барацьбы за высокі ўраджай займаюцца не тым, чым трэба. У канцылярыі аграному няма чаго рабіць. Яго рабочае месца на калгасным полі, у брыгадзе.

У спрэчках па дакладу тав. Нікіціна выступілі таксама старшыня выканкома Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных тав. Мачульскі, старшыня калгаса «Чырвоны гароднік», Мінскага раёна, тав. Трушкевіч, старшыня калгаса «Чырвоны спецыяліст» тав. Глебка. Усяго ў спрэчках выступіла 37 чалавек.

На нарадзе з вялікай прамовай выступіў, цёпла сустрэты перадавікамі сельскай гаспадаркі, сакратар ЦК КП(б)Б тав. П. В. Кісялёў.

Удзельнікі нарады выпрацавалі і прынялі канкрэтныя абавязацельствы па ўздыму ўраджайнасці і паспяховаму правядзенню сяўбы і выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва калгаснікаў і ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі Бабруйшчыны.

З вялікім уздымам быў прыняты тэкст прывітальнага пісьма Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Маршалу Совецкага Саюза таварышу Сталіну.

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Сёння, 28 сакавіка, у 16 гадзін 30 мінут у МАСКВЕ на Краснай плошчы адбудзецца пахаванне Маршала Совецкага Саюза ШАПАШНІКАВА Б. М., старэйшага ваеннага кіраўніка і будаўніка ўзброеных сіл Совецкага Саюза.

Армія і флот Совецкага Саюза схіляюць свае баявыя сцягі перад труной ШАПАШНІКАВА і аддаюць чэсць аднаму з выдатных палкаводцаў Чырвонай Арміі.

ЗАГАДВАЮ:

У часе пахавання Маршала Совецкага Саюза ШАПАШНІКАВА аддаць памёршаму апошнюю воінскую пашану і правесці ў сталіцы нашай Радзімы МАСКВЕ салют у 24 артылерыйскія залпы са ста дваццаці чатырох гармат.

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

28 сакавіка 1945 г.

ПАХАВАННЕ МАРШАЛА СОВЕЦКАГА САЮЗА Б. М. ШАПАШНІКАВА

У ноч на 28 сакавіка адбылася крэмацыя цела Маршала Совецкага Саюза Барыса Міхайлавіча Шапашнікава. Учора з 10 гадзін раніцы урна з прахам нябожчыка была ўстаноўлена ў Калонным Залі Дома Саюзаў. І, як і напярэдадні, людскі паток зноў хлынуў у зал. Праходзяць дэлегацыі ад раёнаў Масквы, ваенных часцей і ваенна-навучальных устаноў, наркаматаў. Людзі самых рознастайных прафесій і ўзростаў прыходзяць ў зал, каб аддаць апошні доўг чалавеку, які сваім талентам і ведамі беззаветна служыў справе партыі Леніна—Сталіна, справе працвітання нашай магутнай дзяржавы.

У ганаровым карауле ля урны з прахам Б. М. Шапашнікава побач з маршаламі, генераламі, Героямі Совецкага Саюза стаяць маскоўскія работніцы, дзеячы мастацтваў, вынаходцы, студэнты. Жалобную вахту нясуць Галоўны Маршал артылерыі Воранаў, Маршал артылерыі Якаўлеў, Маршал інжынерных войск Вараб'ёў, генерал арміі Антонаў, генерал арміі Хрулёў, генерал-палкоўнікі Арцем'еў, Грамадзін, Драчоў, Рыбісаў, Шахурын, Шпеменка.

У 2 гадзіны 30 мінут дня допуск у зал спыняецца. Ля пастамента астаюцца члены ўрадавай камісіі па арганізацыі пахавання, маршалы і вышэйшыя афіцэры генеральнага штаба Чырвонай Арміі, сябры і сваякі нябожчыка. У апошні ганаровы караул становяцца таварышы Швернік, Антонаў, Голікаў, Горкін, Папоў, Лазоўскі, Мардвінаў.

У 3 гадзіны члены ўрадавай камісіі таварышы Швернік, Антонаў і другія падымаюць урну і накіроўваюцца да выхаду. Уперадзе працэсіі група генералаў нясе падушкі з ордэнамі Б. М. Шапашнікава. Затым следуюць вянкі ад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна, Совета Народных Камісараў СССР, Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР, Народнага Камісарыята Абароны СССР, генеральнага штаба Чырвонай Арміі, МК і МГК ВКП(б), Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных.

Жалобны картэж накіроўваецца праз Охотны рад і Манежную плошчу на Красную плошчу. На ўсім шляху яго суправаджае ганаровы воінскі эскорт. Радыёрэпрадуктары разносяць словы загада Вярхоўнага Галоўнакамандуючага:

— Армія і флот Совецкага Саюза схіляюць свае баявыя сцягі перад труной Шапашнікава і аддаюць чэсць аднаму з выдатных палкаводцаў Чырвонай Арміі...

На Краснай Плошчы застыглі настроеныя войскі.

На трыбуну маўзалея падымаюцца таварышы Сталін, Молатаў, Калінін, Швернік, Воранаў, Антонаў, Голікаў, Папоў, Горкін, Мардвінаў, Лазоўскі.

Чатыры гадзіны дня.

Генерал-палкоўнік Голікаў адкрывае жалобны мітынг.

Ад імені Соўнаркома СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) выступае першы намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Н. М. Швернік; ад Народнага Камісарыята Абароны Саюза ССР—начальнік генеральнага штаба Чырвонай Арміі генерал арміі А. Н. Антонаў; ад імені працоўных сталіцы — старшыня выканкома Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных тав. Г. М. Папоў.

Жалобны мітынг скончан. Таварышы Сталін, Молатаў, Калінін, Швернік, Воранаў, Папоў, Голікаў, спусціўшыся з трыбуны маўзалея, падымаюць урну з прахам В. М. Шапашнікава і накіроўваюцца да Крэмлёўскай сцяны.

Калі урну ўстанаўляюць у сцяне, раздаюцца адзін за другім дваццаць чатыры артылерыйскія залпы са ста дваццаці чатырох гармат. Гукі жалобных мелодый змяняюцца ўрачыстай музыкай дзяржаўнага гімна Совецкага Саюза. Вярхоўны Галоўнакамандуючы і яго саратнікі падымаюцца на трыбуну маўзалея. Чотка адбіваючы крок, праходзяць міма маўзалея войскі. Праходзяць удзельнікі пабедных баёў з нямецкімі захопнікамі, ідуць слухачы ваенных акадэмій, курсанты, ваенныя маракі, прадстаўнікі розных родаў доблеснай совецкай зброі, аддаючы апошнюю воінскую пашану восначальніку, усё слаўнае жыццё якога было прысвечана справе працвітання нашай вялікай совецкай Радзімы.

(ТАСС).

На сходзе сялян Пінскай абласці

ПІНСК, 28 сакавіка. **(Па тэлефону ад спец. кар. «Звязды»).** Яшчэ напярэдадні адкрыцця схода сялян горад быў упрыгожан шматлікімі лозунгамі і транспарантамі. Горад падрыхтаваўся ветліва сустрэць дарагіх гасцей—дэлегатаў схода. Адна за другой у абласны цэнтр пачалі прыбываць дэлегацыі сялян. Адны з іх прыехалі на поездзе, другія на фурманках, трэція—прышлі пяшком. Яны ўважліва аглядаюць вуліцы, разбураныя нямецкімі акупантамі дамы, падоўту прастойваюць на плошчы каля карты франтоў Айчыннай вайны.

Шчодра грэе веснавое сонца. З-за ракі Піна, дзе раскінуліся палі і велізарныя балотныя лугі, даносяцца песні жаваранкаў і крыкі кнігавак. На Палессі вясна. На поле выехалі першыя сейбіты. У пульхную зямлю яны кінулі першае зерне. І вось яны, прадстаўнікі шматлікіх вёсак, гаспадары вызваленай зямлі Палесся прыехалі на свой абласны сход, каб абмеркаваць, як лепш і хутчэй правесці сяўбу, адбудаваць зруйнаваныя ворагам вёскі, аднавіць разбураную тітлераўцамі сельскую гаспадарку.

27 сакавіка ўпрыгожаны зал гарадскога тэатра запоўнілі барадатыя дзяды, пажылыя сялянкі, маладыя дзяўчаты, аграномы, зоатэхнікі, прадстаўнікі партыйных, совецкіх і земельных арганізацый, шматлікія госці. З 11 раёнаў абласці на сход прыехаў 621 дэлегат.

Роўна ў 12 гадзін старшыня выканкома абласнога Совета дэпутатаў працоўных тав. С. І. Красоўскі адкрывае сход. Урачыста гучыць Гімн Совецкага Саюза. Дэлегаты выбіраюць кіруючыя органы схода. Доўга несціхаючай авацыяй прысутныя сустракаюць прапанову аб выбранні ў ганаровы прэзідыум схода Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з правадыром народаў, Маршалам Совецкага Саюза таварышом Сталіным. Гучаць усхваляваныя галасы: «Вялікаму Сталіну слава!», «Няхай жыве наша вызваліцельніца—доблесная Чырвоная Армія!».

Слова для даклада аб задачах па падрыхтоўцы і правядзенню веснавой сяўбы 1945 года прадастаўляецца сакратару абкома партыі тав. А. Е. Кляшчову.

Першую частку даклада тав. Кляшчоў прысвячае гістарычным перамогам Чырвонай Арміі, якая вызваліла ўсю совецкую зямлю ад гітлераўскай погані, перанесла ваенныя дзеянні на тэрыторыю ворага і паспяхова прасоўваецца ўсё далей і далей на захад.

Дакладчык падрабязна спыняецца на пытанні аб тых вялікіх разбурэннях, якія прычынілі нямецка-фашысцкія акупанты абласці, таворыць аб закатаваных і заняволеных гітлераўцамі тысячах людзей. Ён таворыць аб народнай вайне, якую ўзнялі жыхары Палесся супроць чужаземцаў. Сотні імён упісалі палешукі ў залатую кнігу барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У гэтай кнізе на відным месцы стаяць імёны двух старых братоў—беларускіх сусанінаў з вёскі Новіна, Ленінскага раёна, — 75-гадовага Міхаіла і 70-гадовага Івана Цуба, якія палі ад рук гітлераўцаў за свабоду і шчасце свайго народа.

— Гісторыя беларускага народа,—гаворыць дакладчык,—гэта шматвекавая гісторыя барацьбы супроць сацыяльнага і нацыянальнага гнёту, гэта гісторыя барацьбы за ўз'еднанне беларускіх земляў у адзіную беларускую дзяржаву. Ажыццявіць сваю векавую мару беларускі народ змог толькі пры совецкай уладзе. У верасні 1939 года гераічная Чырвоная Армія, выконваючы волю совецкага народа, падала руку брацкай дапамогі і вызваліла адзінакроўных братоў-беларусаў, якія насяляюць Заходнюю Беларусь.

Дакладчык далей гаворыць аб тым, як нязносна цяжкім было жыццё беларусаў у панскай Польшчы. У Палескім ваяводстве намешчыкі мелі сотні тысяч гектараў зямлі, а побач дзесяткі тысяч беззямельных сялян. Сяяной стаялі цудоўныя лясы, прасціраліся багатыя рыбныя вадаёмы, але селянін не меў права высечы сабе бярозку на аглоблю, збіраць грыбы і ягады, не меў права лавіць рыбу. Усё гэта было панскім.

Совецкая ўлада надзяліла зямлёй усіх беззямельных і малазямельных сялян, дала жывёлу. З 1939 па 1941 год у абласці было раздана сялянам 181.000 гектараў зямлі, 6.538 галоў буйнай рагатай жывёлы, 3.998 галоў дробнай жывёлы і 1.258 коней. Атрымаўшы свабоду і зямлю, сяляне хутка пайшлі па шляху росквіту і паляпшання добрабыту.

Акупіраваўшы Беларусь, гітлераўцы адабралі ў сялян зямлю і зноў іх заняволілі.

Прышла доблесная Чырвоная Армія, якая выратавала ад знішчэння тысячы людзей, прынесла ім свабоду і шчасце.

З часу вызвалення ад нямецкіх акупантаў у абласці праведзена значная работа па аднаўленню разбуранай ворагам народнай гаспадаркі. Дапамагаючы Чырвонай Арміі хутчэй дабіць фашысцкага звера, сяляне абласці своечасова выканалі ўсе дзяржаўныя пастаўкі, планы лесанарыхтовак і лесавывазкі. У абласці адноўлена і пабудавана каля 8.000 сялянскіх дамоў. Вёска Беразнякі, Ленінскага раёна, дзе немцы спалілі ўсе 115 дамоў, поўнасцю адбудавана.

— Выконваючы пастанову СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год,—гаворыць дакладчык,—неабходна веснавую сяўбу правесці хутка і высокаякасна, засеяць кожны кавалак зямлі. У радзе раёнаў абласці пачаліся палявыя работы. Але ў Давыд-Гарадоскім, Драгічанскім, Жабчыцкім раёнах у некаторых вёсках не закончан яшчэ рамонт інвентару. Арганізоўваючы машынна-конныя пракатныя пункты, правільна выкарыстоўваючы коней і прывучаючы да работы малапрадуктыўных кароў, трэба ўсямерна дапамагчы сем'ям франтавікоў і партызан, бясконным гаспадаркам апрацаваць і абсеяць сваю зямлю. Не ўсе раёны абласці закончылі зварот зямлі сялянам, адабранай у іх гітлераўцамі. Да такіх адносяцца Ганцэвіцкі, Пінскі і некаторыя іншыя раёны. Трэба як мага хутчэй вярнуць зямлю сялянам.

Перадавая частка сялянства, пераканаўшыся ў жыццёвасці і перавазе калгаснага ладу, стала на шлях арганізацыі калгасаў. Сяляне вёсак Кузічы, Ленінскага раёна, і Бабровічы, Целеханаўскага раёна, амаль усе ўступілі ў калгасы. 98 гаспадарак вёскі Яскевічы, Ленінскага раёна, таксама аб'ядналіся ў калгас. У абласці арганізавана 7 калгасаў.

Словы дакладчыка аб тым, што неабходна аказваць усямерную дапамогу сялянам, якія ўступаюць у калгасы, прысутныя сустракаюць бурнымі апладысментамі.

Адразу-ж пасля даклада ў зал і на сцэну пад гукі горна і барабана заходзіць дэлегацыя піянераў ад пінскіх школ. Піянеры вітаюць дэлегатаў схода, расказваюць аб шчаслівым, радасным дзяцінстве, якое даў ім вялікі Сталін. Дружнымі апладысментамі праводзяць іх дэлегаты.

Першым у спрэчках выступае селянін вёскі Белавушы, Столінскага раёна, тав. Бараноўскі. Ён гаворыць аб тым, як сяляне іх сельсовета аказваюць усямерную дапамогу фронту. Рыхтуючыся да сяўбы, у вёсках сельсовета арганізавана 6 брыгад па аказанню дапамогі бясконным гаспадаркам.

Старшыня Агарэвіцкага сельсовета, Ганцэвіцкага раёна, тав. Врублеўскі гаворыць, што ў сельсавеце арганізавана два збожжа-ачышчальныя пункты. Гэта дало магчымасць усім сялянам падрыхтаваць да сяўбы высокаякаснае насенне.

З вялікай увагай прысутныя выслухалі прамову старшыні калгаса «Серп і молат», Целеханаўскага раёна, тав. Квашчэвіча.

— Наш калгас быў арганізаван яшчэ да вайны,—гаворыць. ён. — Атрымаўшы ад совецкай дзяржавы зямлю, мы, былыя батракі, беднякі і сераднякі, змагаліся за лепшае, поўнае дастатку жыццё. Нямецкія акупанты разбурылі наш калгас. Але з прыходам Чырвонай Арміі мы зноў аднавілі яго. Сяляне нашай вёскі пераканаліся на справе, што адзіны шлях да лепшага жыцця гэта — калгасны лад. Вось чаму мы так дружна рыхтаваліся да сяўбы і першымі ў абласці пачалі яе. Нашы сяляне гавораць, што кожнае кінутае ў зямлю зерне — гэта таксама куля па ворагу. Чым хутчэй і лепш мы пасеем, тым хутчэй Чырвоная Армія даб'е ворага.

На трыбуну выходзіць пажылая сялянка з Пінскага раёна, тав. Пакроўская.

— Я—маці дзевяці дзяцей,—гаворыць яна. — Совецкая ўлада аказвала і аказвае мне дапамогу па многадзетнасці. Цяпер я прадстаўлена да ўзнагароды ордэнам «Материнская слава». Толькі наш совецкі ўрад так высока ацаніў чэсць мацеры, і я гэтым ганаруся. Калі прышла чорная чэсіна нямецкай няволі, я благаславіла свайго сына Аляксандра на ратныя подвігі. Ён пайшоў добраахвотна ў Чырвоную Армію. Другі мой сын Нікалай забіт немцамі, а трэцяга сына я благаславіла на слаўныя партызанскія справы. За сыноў маіх гітлераўцы арыштавалі мяне і ўсю маю сям'ю. Яны хацелі нас знішчыць, але гэта ім не ўдалося. Мае сыны і тысячы сыноў совецкіх мацярэй, у асобе нашай гераічнай Чырвонай Арміі вызвалілі нас ад смерці. Цяпер два мае сыны ў радах Чырвонай Арміі громяць ненавіснае гітлераўскае племя ў самой Германіі.

Тав. Пакроўская заклікае прысутных у імя хутчэйшай перамогі над ворагам усямерна змагацца за лепшае і высокаякаснае правядзенне веснавой сяўбы.

Пра вопыт работы перадавіка ў абласці—Брашэвіцкі сельсовет, Драгічынскага раёна, — расказаў селянін тав. Чэпура.

— Наш сельсовет з'яўляецца перадавым таму, што ў яго работу ўцягнуты шырокія сялянскія масы. Кожную справу сельсовет праводзіць не адзін, а пры дапамозе актывістаў. Мы з'яўляемся ў абласці ініцыятарамі важнай справы стварэння хаўчовага фонду дапамогі сем'ям франтавікоў і партызан. У гэты фонд нашы сяляне ўнеслі 15 тон збожжа і 29 тон бульбы. Закончыўшы вывазку лесу, мы да пачатку палявых работ паставілі коней на адпачынак і ўзмоцнена іх кармілі. Апрацоўку зямлі мы будзем праводзіць звенямі і брыгадамі. Кожны конь у нас замацаваны за двума, трыма гаспадаркамі. Гэта па нашаму называецца звяно. У цэлым-жа цэлы населены пункт у нас складае брыгаду. У працэсе працы бывае так, што не ўсюды можна адначасова праводзіць палявыя работы. Вось чаму брыгада ў першую чаргу выедзе на поле таго селяніна, дзе земля падсохла ўжо і яе можна апрацоўваць.

Вопытам работы па падрыхтоўцы да сяўбы дзеляцца: старшыня калгаса імя Молатава, Ленінскага раёна, тав. Кучынскі, селянін вёскі Беркозы, Жабчыцкага раёна, тав. Свірэпа, селянін вёскі Сінкевічы, Пінскага раёна, былы дэпутат Верхняга Схода заходняй Беларусі тав. Шы[illegible]. Усяго ў спрэчках па дакладу выступіла 16 чалавек.

Выключна цёпла сустрэлі ўдзельнікі схода выступленне главы беларускага ўрада тав. П. К. Панамарэнка, які ад імя беларускага ўрада, ЦК КП(б)Б і асабіста таварыша Сталіна перадаў прывітанні сходу сялян. Яго прамова некалькі разоў перарывалася бурнымі апладысментамі.

Ставячы перад сялянамі Пінскай абласці канкрэтныя задачы па лепшаму правядзенню веснавой сяўбы і хутчэйшаму аднаўленню разбуранай ворагам сельскай гаспадаркі, тав. Панамарэнка заклікае і метадамі народнай будоўлі хутчэй аднавіць Дняпрабугскі канал.

На сцэну ўзнімаецца дэлегацыя сялян. У руках яны трымаюць вышытую беларускую кашулю, ручнік і пояс, выдатныя работы. Дэлегацыя падыходзіць да Старшыні Совета Народных Камісараў БССР сакратара ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка і просіць яго ад імені сялян Пінскай вобласці перадаць гэты невялічкі падарунак Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Маршалу Совецкага Саюза таварышу Сталіну.

— Перадам, абавязкова перадам таварышу Сталіну, — прымаючы падарунак гаворыць тав. Панамарэнка.

Яго словы тонуць у буры авацый і прывітальных воклічаў у чэсць вялікага Сталіна.

Пад такую-ж дружную авацыю сход сялян прымае тэкст прывітальнага пісьма Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Маршалу Совецкага Саюза таварышу Сталіну.

Сход таксама прымае тэкст прывітальнага пісьма ЦК КП(б)Б і Соўнаркому БССР.

Затым сход прымае выклік сялян Брэсцкай абласці аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за лепшую падрыхтоўку і высокаякаснае правядзенне веснавой сяўбы і ўсяго сельскагаспадарчага года, за хутчэйшае аднаўленне сельскай гаспадаркі.

Сход віталі дэлегацыі ад рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў пінскіх прадпрыемстваў, а таксама ад часцей гарнізона.

Вечарам для ўдзельнікаў схода быў наладжан канцэрт з удзелам лунінецкага хора сялянскай моладзі.

М. ВІШНЕЎСКІ.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 28 САКАВІКА

На працягу 28 сакавіка на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА войскі 3-га БЕЛАРУСКАГА фронта прадаўжалі баі па знішчэнню рэштак разгромленых часцей праціўніка ў раёне мыса КАЛЬХОЛЬЦЭР-ХАКЕН. У баях за 27 сакавіка ў гэтым раёне войскі фронта захапілі наступныя трафеі: гармат—222, мінамётаў—223, кулямётаў—430, бронетранспарцёраў—22, радыёстанцый—35, аўтамашын—1.500.

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта 28 сакавіка штурмам авалодалі горадам ГДЫНЯ — важнай ваенна-марской базай і буйным портам на Балтыйскім моры.

У баях за ГДЫНЯ войскі фронта ўзялі ў палон да 9.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, а таксама захапілі многа ўзбраення і рознай ваеннай маёмасці.

Адначасова войскі фронта, пасля ўпорных баёў, занялі заходнюю частку горада ГДАНЬСКА (ДАНЦЫГА) і ачышчалі ад праціўніка гарадскі раён, размешчаны на востраве ХОЛМ.

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне па паўднёваму берагу ДУНАЯ, 28 сакавіка авалодалі гарадамі ДЗЬЕР і КОМАРОМ — важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на Венскім напрамку, а таксама з баямі занялі больш 40 іншых населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты ГЕНЬЮ, ДЗЬЕРСЕНЦІВАН, КІШМЕДЗЬЕР, МЕНФЕ, НІУЛФАЛУ.

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, развіваючы наступленне, фарсіравалі раку РАБА і 28 сакавіка авалодалі гарадамі ЧОРНО і ШАРВАР — важнымі вузламі чыгунак і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў, якія прыкрываюць шлях да граніц Аўстрыі, а таксама занялі больш 150 іншых населеных пунктаў, сярод якіх буйныя населеныя пункты РАБА-СЕНТМІХАЛЬ, РАБА-ПОРДАНІ, РАБА ШЭБАШ, ПАПОЦ, ОСТФІАШСОНІФА, ГЕРЧЭ, КАЛД, БЕГЕТЭ, ЧАБРЭНДЭК, ШУМЕГ, ЗАЛАСЕНТГРОТ, БАЖЫ, ОЛШО, НЕМЕШ-ВІТА, СІГЛІГЕТ і чыгуначныя станцыі ГЕРЧЭ, КАЛД, УК, ГОГАНФА, ШУМЕГ. У баях за 27 сакавіка войскі фронта ўзялі ў палон звыш 1.500 салдат і афіцэраў праціўніка.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 27 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 190 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 96 самалётаў праціўніка.

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 29 САКАВІКА

Войскі 3-га БЕЛАРУСКАГА фронта 29 сакавіка завяршылі ліквідацыю акружанай усходне-пруская групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА. За час баёў з 13 па 29 сакавіка немцы страцілі звыш 50 тысяч палоннымі і 80 тысяч забітымі, пры гэтым войскі фронта захапілі наступныя трафеі: самалётаў—128, танкаў і самаходных гармат—605, палявых гармат—звыш 3.500, мінамётаў—1.440, кулямётаў—6.447, бронетранспарцёраў — 586, радыёстанцый 247, аўтамашын — 35.060, трактараў і цягачоў—474, паравозаў—232, чыгуначных вагонаў — 7.673, складаў з боепрыпасамі, узбраеннем, прадуктамі харчавання і іншай ваеннай маёмасцю — 313.

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта прадаўжалі баі па ачышчэнню ад праціўніка ўсходняй часткі горада ГДАНЬСКА (ДАНЦЫГА) і знішчалі групу войск немцаў, прыціснутую да ўзбярэжжа Данцыгскай бухты на поўначы ад горада ГДЫНЯ. У баях за 28 сакавіка ў гэтым раёне войскі фронта ўзялі ў палон 18.500 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі наступныя трафеі: самалётаў—50, танкаў і самаходных гармат —67, палявых гармат—369.

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, у выніку імклівага наступлення, 29 сакавіка авалодалі гарадамі і важнымі вузламі дарог—СОМБАТЭЛЬ, КАПУВАР і, заняўшы горад КЕСЕГ, выйшлі на аўстрыйскую граніцу, а таксама з баямі занялі больш 100 другіх населеных пунктаў у тым ліку буйныя населеныя пункты ФАРАД, МІХАЛЫ, БЕЛЕД, ЧАНІГ, БЮК, НАДЗЫГЕНЧ, ВЕП, ПЕЦЭЛЬ, ІКЕРВАР, ДЗЬЕРЦЬЯНОШ, БАЛТАВАР, ЗАЛАСАНТО, РЭЗІ і чыгуначныя станцыі ТОТКЕРЭСТУР, БЕЛЕД, РЭПЧЭЛАК, ХЕДЗЬФАЛУ, БЮК. У баях за 28 і 29 сакавіка войскі фронта, паводле папярэдніх даных, узялі ў палон больш 18 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі наступныя трафеі: самалётаў—115, танкаў і самаходных гармат — 71, палявых гармат — 102.

На другіх участках фронта—баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 28 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 98 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 23 самалёты праціўніка.

* * *

Войскі 3-га Беларускага фронта сёння завяршылі ліквідацыю акружанай усходне-пруская групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад Кенігсберга. Праціўнік, заціснуты на мысе Кальхольцэр-Хакен рабіў адчайныя намаганні, каб пратрымацца яшчэ некалькі дзён, разлічваючы за гэты час вывезці морам рэшткі сваіх разгромленых злучэнняў. Совецкія войскі сарвалі гэты план немцаў. Усе прычалы, якія асталіся ў руках ворага, няспынна бамбардыраваліся авіяцыяй і абстрэльваліся артылерыяй. Тым часам нашы танкісты і пехацінцы нанеслі рашаючы ўдар на апошняму аплоту немцаў—прыбярэжнаму пасёлку Бальга і акружаючым яго вышыням. Немцы сканцэнтравалі ў гэтым раёне адборныя атрады эсэсаўцаў. Пад прыкрыццём магутнага артылерыйскага агню, совецкія падраздзяленні рушылі ў атаку і пасля жорсткага бою авалодалі пасёлкам Бальга. Услед за гэтым нашы байцы занялі ўмацаваныя вышыні. У баі за пасёлак знішчана звыш 3.000 гітлераўцаў, пераважна эсэсаўцаў і штрафнікоў. Захоплена 1.800 палонных, многа танкаў, палявых гармат, кулямётаў, аўтамашын, склады з боепрыпасамі і ваеннай маёмасцю. Імклівае прасоўваючыся на поўнач, нашы войскі занялі апорны пункт Кальхольц. Атрады нямецкіх афіцэраў, якія яго абаранялі, былі знішчаны. Услед за падзеннем Кальхольца арганізаванае супраціўленне ворага спынілася. Немцы сталі натоўпамі здавацца ў палон. Ліквідацыя буйнай групы нямецкіх войск на паўднёвым захадзе ад Кенігсберга паспяхова завершана. На дарогах канваіруюцца тысячы ўзятых у палон нямецкіх салдат і афіцэраў.

* * *

Войскі 2-га Беларускага фронта прадаўжалі паспяховыя баі ў горадзе Гданьску (Данцыгу). Немцы заселі ў дотах і ўмацаваных будынках і аказваюць упорнае супраціўленне. Совецкія штурмавыя атрады, узмоцненыя гарматамі і танкамі, перадольваюць завалы і барыкады на вуліцах і падаўляюць варожыя вузлы супраціўлення. Уся цэнтральная частка горада ачышчана ад нямецкіх войск. Пасля жорсткага бою нашы войскі фарсіравалі раку Мёртвая Вісла і авалодалі большай часткай Гданьскага парта. Нашы часці дабіваюць апошнія варожыя групы ў паўночна-заходняй частцы вострава Холм і вядуць паспяховыя баі за авалоданне ўсходняй часткай горада. Месцы баёў завалены трупамі гітлераўцаў. Дэмаралізаваныя групы нямецкіх салдат спыняюць супраціўленне і здаюцца ў палон.

У баях за авалоданне горадам Гдыня войскі фронта разграмілі 5 пяхотных, танкавую, матарызаваную эсэсаўскую дывізію, 2 артылерыйскія брыгады, рад асобных батальёнаў і іншыя часці і падраздзяленні праціўніка. Рэшткі разгромленых нямецкіх дывізій прыціснуты да Данцыгскага заліва на поўначы ад Гдыні і знішчаюцца нашымі войскамі. Уся тэрыторыя, якую займаюць немцы ў гэтым раёне, знаходзіцца пад абстрэлам совецкай артылерыі.

* * *

Войскі 3-га Украінскага фронта, прарваўшы абарону праціўніка на рацэ Раба, развівалі імклівае наступленне. Совецкія часці прасунуліся ўперад на 30 кілометраў і штурмам авалодалі венгерскім горадам Кесег. Заняўшы гэты горад, нашы войскі выйшлі на аўстрыйскую граніцу. Жорсткія баі сёння адбываліся за горад Сомбатэль. Нямецкі гарнізон, узмоцнены адступаючымі часцямі, умацаваўся на ўсходніх ускраінах горада і неаднаразова пераходзіў у контратакі. Совецкія танкісты, зрабіўшы абходны манеўр, нанеслі праціўніку ўдар ў фланг і ўварваліся ў Сомбатэль. У жорсткім вулічным баі варожы гарнізон быў разбіт і ў беспарадку адступіў на захад. Нашы войскі захапілі вялікія трафеі, у тым ліку бронепосад, 28 паравозаў і 360 вагонаў з грузамі.

* * *

Войскі 2-га Украінскага фронта, якія авалодалі ўчора горадам Дзьер, захапілі ў немцаў 70 гармат, 210 кулямётаў, 70 паравозаў, звыш 2.000 вагонаў з грузамі і іншыя трафеі.

* * *

Караблі Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота патапілі ў Балтыйскім моры два нямецкія транспарты, агульным водазмяшчэннем у 13 тысяч тон. Апрача таго, сур'ёзна пашкоджаны два іншыя судны праціўніка.

Нашы тарпедныя каперы ў раёне Клайпелы (Мемеля) у начным баі патапілі два нямецкія каперы.

ДЗЕЯННІ НАШАЙ АВІЯЦЫІ

УДАРЫ АВІЯЦЫІ ЧЫРВОНАСЦЯЖНАГА БАЛТЫЙСКАГА ФЛОТА

26 сакавіка авіяцыя Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота прадаўжала паносіць бомба-штурмавыя ўдары па нямецкіх транспартах у Балтыйскім моры. У выніку гэтых удараў у паўднёва-усходняй частцы Балтыйскага мора на поўначы ад Гданьска патоплены: пяць транспартаў і адзін танкер агульным водазмяшчэннем у 31 тысячу тон, два вартавыя караблі і адзін тральшчык праціўніка.

* * *

НАЛЁТЫ НАШАЙ АВІЯЦЫІ НА ПІЛАУ, ХЕЛЬ, СОМБАТЭЛЬ І МАРАЎСКА-ОСТРАВА

У ноч на 28 сакавіка нашы цяжкія бамбардыроўшчыкі нанеслі ўдары па ваенных аб'ектах і суднах праціўніка ў партах Пілау і Хель і па чыгуначных вузлах Сомбатэль (у Венгрыі) і Мараўска-Острава (у Чэхаславакіі).

У выніку бамбардыроўкі ў партах Пілау і Хель узніклі вялікія пажары, якія суправаджаліся моцнымі выбухамі. Адзначаны прамыя попаданні бомб у два транспарты праціўніка.

На чыгуначных вузлах Сомбатэль і Мараўска-Острава бамбардыроўкай створана многа пажараў, гарэлі воінскія эшалоны немцаў.

* * *

НАЛЁТ НАШАЙ АВІЯЦЫІ НА ГОРАД ШОПРОН У ВЕНГРЫІ

У ноч на 29 сакавіка нашы цяжкія бамбардыроўшчыкі нанеслі ўдар па чыгуначнаму вузлу Шопрон у Венгрыі. У выніку бамбардыроўкі на тэрыторыі вузла ўзніклі пажары, якія суправаджаліся выбухамі. Да світання ўвесь чыгуначны вузел Шопрон быў ахоплен агнём, гарэлі эшалоны і ваенныя склады праціўніка.

БРЭСЦКАЯ ОБЛАСЦЬ НАПЯРЭДАДНІ СЯЎБЫ

25 сакавіка па-святочнаму ўпрыгожаны клуб горада Брэста напоўніўся сялянамі-дэлегатамі, якія сабраліся на другі абласны сход, каб абмеркаваць пытанне завяршэння падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы гэтага года. З дакладам выступіў сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б тав. Тупіцын.

Адзін за другім выступалі дэлегаты. Ад імені сваіх аднасельчан яны дзякавалі партыю і ўрад, дзякавалі Чырвоную Армію і асабіста таварыша Сталіна за сваё вызваленне з нямецкага ярма, за зямлю, якая вернута ім. Дэлегаты расказвалі аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, бралі на сябе абавязацельствы ў соцыялістычным спаборніцтве за хутчэйшае аднаўленне сельскай гаспадаркі, за ўзорнае правядзенне сяўбы з тым, каб атрымаць у гэтым годзе высокі ўраджай.

З вялікай прамовай аб задачах сялян у веснавой сяўбе выступіў цёпла сустрэты Старшыня Соўнаркома Беларускай ССР таварыш Панамарэнка.

На сходзе былі абмеркаваны і прыняты абавязацельствы соцыялістычнага спаборніцтва з сялянамі Пінскай абласці.

Ніжэй мы друкуем выступленні ряду ўдзельнікаў другога сходу сялян Брэсцкай абласці.

25 сакавіка ў Брэсце адбыўся 2-гі сход сялян абласці. У рабоце схода прымаў удзел Старшыня Соўнаркома Беларускай ССР таварыш Панамарэнка. НА ЗДЫМКУ: у часе перапынку таварыш Панамарэнка гутарыць з дэлегатамі. На пераднім плане (злева направа) таварыш Панамарэнка, селянін вёскі Ярашэвічы, Ружанскага раёна, Дзмітрый Ушкар і сялянка вёскі Малькі, Брэсцкага раёна, маці-гераіня Марыя Целенкевіч.

Фото А. Карніцкага.

ДА СЯЎБЫ ГАТОВЫ

У 1940 годзе ў былым панскім маёнтку Султана быў арганізаван наш калгас імені Молатава. Калгас меў да пачатку вайны 600 гектараў зямлі, 30 коней, 80 кароў і столькі-ж свіней. У арцелі было 34 сем'і—былых батракоў і сялян вёскі Сцепанкова.

Маладыя калгаснікі, якія не мелі раней кавалка хлеба, за сваю добрасумленную працу у калгасе атрымалі багатую аплату, пераканаліся на сваім вопыце ў выгодзе калектыўнай працы і яе высокай прадукцыйнасці.

У 1941 г. на нашу зямлю напалі гітлераўскія бандыты. Яны ліквідавалі калгас і стварылі на яго землях свой нямецкі маёнтак. Калгаснікаў прымусілі працаваць у якасці батракоў. Немцы вывезлі ў Германію ўсю калгасную жывёлу, угналі на катаргу многіх людзей. У двух кілометрах ад калгаса летам 1942 года нямецкія каты спалілі вёску Дрэмлева, а ў адным з будынкаў спалілі зажыва 270 яе жыхароў.

Страшна было жыць. Але нашы калгаснікі верылі, што недалёк той час, калі Чырвоная Армія вызваліць совецкіх людзей з няволі. І вызваленне прыйшло. З першых дзён свабоднага жыцця ў калгасе пачаліся работы па аднаўленню гаспадаркі. Быў збран ўраджай з плошчы ў 173 гектары і засеена 30 гектараў азімага жыта і пшаніцы.

За 5 месяцаў, са жніўня па снежань, калгаснік В. Ніляцкі выпрацаваў са сваёй сям'ёй больш 300 працадзён, па якія атрымаў 110 пудоў збожжа. Многа збожжа атрымалі калгасны конюх Осіп Верабей, калгаснікі А. Кадзей, І. Дзмітрук і другія.

Цяпер у калгасе ёсць 22 рабочых коней, 15 галоў маладняка і 16 свіней. Падрыхтаван інвентар для веснавых палявых работ, завяршаецца вывазка гною і ачыстка насення. На агульным сходзе калгаснікаў мы прынялі план веснавой сяўбы. У калгасе арганізавана звяно для работы на агародзе. Чотка размеркавана рабочая сіла. За плугамі і боранамі ў асноўным будуць хадзіць жанчыны і падросткі.

Мы ўпэўнены, што план веснавой сяўбы мы выканаем своечасова, сяўбу правядзем у сціслыя тэрміны і на высокім агратэхнічным узроўні. І гэта зразумела. У гэтым годзе мы будзем працаваць на сябе, на карысць сваёй дзяржавы.

Нядаўна ў нашым раёне адноўлен другі калгас, які носіць імя вялікага Сталіна. Калгаснікі гэтай арцелі выклікалі нас на соцыялістычнае спаборніцтва за лепшае правядзенне сяўбы. Мы будзем змагацца, каб перамагчы ў спаборніцтве, сабраць у гэтым годзе высокі ўраджай, зрабіць калгас узорным.

М. ЛУК'ЯНЮК,
старшыня калгаса імені Молатава, Жабінкаўскага раёна.

ШТО РАШЫЎ СХОД СЯЛЯН

На 2-м абласным сходзе, які адбыўся 25 сакавіка, сяляне Брэсцкай абласці абмеркавалі і прынялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў у соцыялістычным спаборніцтве з сялянамі суседняй Пінскай абласці.

Сяляне Брэсцкай абласці абавязваюцца давесці ў гэтым годзе плошчу яравога кліна да ўзроўню 1940 года—91 тысячу гектараў збожжавых, 47 тысяч гектараў бульбы, 2 тысячы гектараў гародніны, 5.500 гектараў тэхнічных і 6 тысяч гектараў кармовых культур; правесці веснавую сяўбу на высокім агратэхнічным узроўні і ў сціслыя тэрміны.

Сяляне абавязаліся да 5 красавіка закончыць на ўсіх МТС і сялянскіх гаспадарках рамонт сельскагаспадарчых машын і інвентару; на сяўбе максімальна выкарыстаць жывое цягло, шырока арганізаваць дапамогу бясконным сялянам з боку гаспадарак, якія маюць коней; на больш лёгкіх работах шырока выкарыстаць малапрадуктыўную буйную рагатую жывёлу.

На працягу лета правесці не менш адной праполкі збожжавых, двух праполак—тэхнічных культур і 2—3-разовае акучванне бульбы. Своечасова пачаць, у сціслыя тэрміны і без страт правесці ўборку ўраджаю: жніво і скірдаванне збожжавых—на працягу 10—12 дзён, абмалот—не пазней 1 лістапада і ўборку бульбы і гародніны—да 25 кастрычніка.

Дабіцца ў гэтым годзе атрымання ўраджаю: жыта—не менш 10 цэнтнераў з гектара, пшаніцы—11 цэнтнераў, яравых збожжавых—9 цэнтнераў і бульбы—150 цэнтнераў з гектара.

Закончыць пад'ём чыстых папараў да 15 чэрвеня, а занятых—за тры тыдні да пачатку сяўбы азімых. Сяўбу азімых правесці на плошчы ў 115 тысяч гектараў—да 15 верасня; зяблевае ворыва—на плошчы ў 82 тысячы гектараў—да 1 лістапада.

У мэтах аднаўлення жывёлагадоўлі сяляне абавязваюцца захаваць і вырасціць маладняк жывёлы і прыплод 1945 года ў кожнай гаспадарцы.

Аказваць усямерную дапамогу сем'ям воінаў Чырвонай Арміі, партызан і інвалідаў Айчыннай вайны, а таксама дапамогу як коньмі, так і насенным матэрыялам, гаспадаркам, якія вельмі пацярпелі ад нямецкіх акупантаў. Для гэтага расшырыць фонды дапамогі, якія створаны пры кожным сельскім совеце.

Удзельнікі другога схода сялян Брэсцкай абласці заклікаюць усіх сялян і спецыялістаў сельскай гаспадаркі ўключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва паміж раёнамі, сельсоветамі і вёскамі за лепшае і хутчэйшае правядзенне веснавой сяўбы.

Сход выбраў дэлегацыю, якая выехала ў Пінск, каб абмеркаваць з сялянамі Піншчыны ўмовы соцыялістычнага спаборніцтва.

(З соцыялістычных абавязацельстваў сялян Брэсцкай абласці).

ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

Я быў дэлегатам першага абласнога схода сялян. Тады мы абмяркоўвалі мерапрыемствы па хутчэйшаму аднаўленню сельскай гаспадаркі, разбуранай нямецкімі акупантамі, таварылі аб тым, як лепш і больш дзейсна дапамагчы нашай роднай Чырвонай Арміі дабіць ненавісную фашысцкую Германію.

З таго часу ў нашым сельсавеце зроблена многа. Мы адрамантавалі і адкрылі чатыры школы, у якіх цяпер навучаюцца нашы дзеці, адкрылі вячэрнюю школу для моладзі, якая ў годы акупацыі не мела магчымасці прадаўжаць сваю адукацыю.

Многа зроблена для дапамогі Чырвонай Арміі. Усе нашы мужчыны прызыўных узростаў пайшлі на фронт. Мы, старыя, жанчыны і падлеткі правялі збор сродкаў у фонд Чырвонай Арміі. Сяляне добраахвотна здалі больш 70 тон збожжа.

Яшчэ зімой у пачатку падрыхтоўкі да веснавой сяўбы перад намі паўсталі пытанні: як будуць апрацоўваць і абсемяняць зямлю сем'і франтавікоў, інвалідаў Айчыннай вайны і партызан, як будуць жыць сем'і, у якіх немцы разграбілі ўсё дабро, у якіх няма працаздольных мужчын і жанчын? Мы разумелі, што ім трэба дапамагчы. Сельсавет падказаў нам стварыць фонд дапамогі. І мы стварылі яго. На добраахвотных пачатках сяляне нашага сельсавета сабралі больш 24 тон насення збожжавых. Цяпер сельсавет размяркоўвае гэтае насенне. У першую чаргу яго атрымліваюць сем'і воінаў Чырвонай Арміі, партызан і інвалідаў вайны. Насенне атрымліваюць усе, хто вельмі пацярпеў ад акупантаў і не мае чым засеяць свае палеткі.

Многа папрацавалі мы, рыхтуючыся да сяўбы. Гэтая работа ў нас праходзіла арганізавана, прадумана. Кожны дэпутат сельсавета, кожны актывіст атрымаў участак, за які ён адказвае. На ўчастках мы ўлічылі, колькі плугоў, бораў або павозак трэба рамантаваць. Затым гэтую работу размеркавалі паміж каваламі. І трэба сказаць, што яны добра справіліся са сваёй задачай. На сёнешні дзень у нас адрамантавана 100 плугоў, 150 бораў, 10 павозак—усё, што было неабходным і патрабуецца для цалявых работ.

У апошні час мы займаемся прымацаваннем бясконных сялян да тых гаспадарак, якія маюць коней. Сяляне вельмі ахвотна бяруцца дапамагаць сваім суседзям. Асаблівымі клопатамі карыстаюцца сем'і франтавікоў і партызан. Кожны імкнецца чым-небудзь дапамагчы, бо разумее, што дапамагаючы ім, ён дапамагае франтавікам біць немцаў.

Асноўныя работы ў падрыхтоўцы да сяўбы ў нас выконвалі жанчыны і, асабліва, моладзь, якая арганізавала ў вёсках ачыстку насення збожжавых. Атрыманы нядрэнныя вынікі. Па сельсавету ачышчана і поўнасцю падрыхтавана да сяўбы больш 1.000 цэнтнераў збожжа.

Цяпер у нас падсыхае глеба, і неўзабаве разгорнуцца масавыя работы ў полі. Мы, сяляне Бытчанскага сельсавета, сустракаем іх падрыхтаванымі. Мы зробім усё, што залежыць ад нас, каб атрымаць у гэтым годзе высокі ўраджай.

А. ДУДКО,
селянін вёскі Шыповічы, Бытчанскага сельсавета, Кобрынскага раёна.

БУДЗЕМ СПАБОРНІЧАЦЬ

Першай у нашай абласці адгукнуўся на заклік Прапойскай МТС аб разгортванні ўсебеларускага соцыялістычнага спаборніцтва калектыў Маларыцкай МТС. Работнікі гэтай МТС выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва нашу, Бярозаўскую МТС.

Выклік маларытцаў мы прынялі і ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы: выпрацаваць у гэтым годзе на кожны 15-сільны трактар не менш 600 гектараў з захаваннем усіх агратэхнічных правіл, зэканоміць гаручага 13 процантаў і змазачнага—6 процантаў. На соцыялістычнае спаборніцтва мы выклікалі суседнюю Дружанскую МТС.

У нашай МТС цяпер ёсць 5 трактараў і 20 коней на конна-пракатным пункце. На нас сяўбы мы бярэм яшчэ 20 коней у раённых арганізацыях. Такім чынам наша МТС здолее у веснавую сяўбу ўзараць не менш 850 гектараў трактарамі і 150 гектараў коньмі. Гэта будзе вялікая і рэальная дапамога бясконным сялянскім гаспадаркам.

Намі адрамантавана 8 трактарных плугоў, 2 сеялкі, культыватар, 8 боран. Да 1 красавіка будзе адрамантаван увесь інвентар, як патрабуе гэтага наш дагавор соцыялістычнага спаборніцтва.

Мы бралі абавязацельства перанадрыхтаваць 7 і падрыхтаваць 12 трактарыстаў на курсах. Гэтае абавязацельства таксама выканана.

Цяпер пры дапамозе сельскіх советаў мы праводзім збор заявак ад сялян на апрацоўку зямлі трактарамі і коньмі, заключаем дагаворы.

У першую чаргу мы будзем апрацоўваць зямлю сем'яў франтавікоў, партызан і інвалідаў Айчыннай вайны.

П. БАНДАРЧЫК,
дырэктар Бярозаўскай МТС.

ПЕРАД ВЫХАДАМ У ПОЛЕ

Тры кашмарныя годы над гарадамі і вёскамі нашай абласці вісела чорная, жахлівая ноч крывавага гітлераўскага тэрора.

Стогн і плач стаяў над зямлёю, гарэлі гарады і вёскі, маці аплаквалі сваіх закатаваных, расстраляных і вывезеных у нямецкае рабства мужоў, сыноў і дочак.

Гітлераўскія людаеды расстралялі ў абласці 54.525 чалавек—жанчын, старых і дзяцей, пагналі на катаргу ў Германію 16.624 чалавекі, пераважна нашу моладзь.

Нямецкія бандыты нанеслі вялікія страты нашай сельскай гаспадарцы. Яны адабралі ў сялян 40.932 кані, 93.918 кароў, 122.962 свіней, 170.336 авечак і коз, спалілі і знішчылі каля 16 тысяч жылых дамоў і больш 26 тысяч надворных будынкаў.

Такія вынікі «гаспадарання» нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Працоўныя нашай абласці не схіліліся перад нямецкімі грабежнікамі. Па закліку вялікага Сталіна яны падняліся на свяшчэнную барацьбу супроць ненавісных ворагаў. У абласці былі створаны падпольныя райкомы і гаркомы партыі, якія ўзначалілі партызанскі рух. Партызаны наносілі адчувальныя ўдары па камунікацыях ворага. Тысячы воінскіх эшалонаў ляцелі пад адкос, падрываліся і знішчаліся танкі і аўтамашыны ворага. Тысячы гітлераўцаў знайшлі сабе магілу ад рук нашых партызан.

Дзень 28 ліпеня 1944 года назаўсёды астанецца ў нашай памяці. У гэты дзень поўнасцю была вызвалена наша абласць. Як толькі адгрымелі апошнія стрэлы, сяляне сабраліся на свой першы абласны сход, каб абмеркаваць і намеціць рад канкрэтных мерапрыемстваў па хутчэйшаму аднаўленню сельскай гаспадаркі, каб абмеркаваць, як лепш і хутчэй дапамагчы нашай Чырвонай Арміі ў яе свяшчэннай вызваленчай вайне.

Вялікія перамогі гераічнай Чырвонай Арміі выклікалі хвалю патрыятычнага ўздыму сярод сялян. Яны датэрмінова выканалі план збожжанарыхтовак, мясапаставак, поўмільёна пудоў збожжа і амаль столькі-ж бульбы здалі ў фонд Чырвонай Арміі.

Нямецка-фашысцкія акупанты з першых дзён свайго прыходу адабралі ў сялян зямлю, арганізавалі 104 нямецкія маёнткі. Немцы прымушалі нашых сялян працаваць у якасці батракоў. У радзе месц нямецкія акупанты прыразалі да маёнткаў і надзельную сялянскую зямлю. Гэтую зямлю яны аддавалі як былым панам і кулакам, так і эсэсаўцам і іншым бандытам з ваеннай фашысцкай зграі.

Як толькі былі адноўлены органы совецкай улады, у абласці неадкладна пачалася раздача зямлі непасрэдным яе гаспадарам—сялянам. У Камянецкім раёне зямля былога маёнтка «Клепачы» размеркавана паміж сялянамі вёсак Ямінка, Клепачы і Булевічы. Зямля маёнтка «Ступічава» размеркавана паміж сялянамі вёсак Ступічава і Навіцковічы, маёнтка «Шышава»—паміж сялянамі вёсак Чарнакі і Шышава і г. д. Па 5 гектараў зямлі атрымалі былыя батракі гэтых вёсак—Пракоп Чыж, Фёдар Гусак, Афанасій Гусак, а таксама малазямельныя сяляне Трафім Дзмітрук, Андрэй Лявосік і многія другія.

У Антопальскім раёне толькі па 4-х сельсоветах 333 беззямельных і малазямельных сялянскіх гаспадарак атрымалі 1.116 гектараў зямлі. Селянін вёскі Кустовічы Пётр Марыневіч атрымаў 12 гектараў. Емельян Аліферын з вёскі Сукачы ўсё жыццё пакутваў на трох гектарах, а цяпер дадаткова атрымаў 9 гектараў добрай зямлі. Васіль Сіліванчык, атрымліваючы зямлю, заявіў прадстаўнікам сельсавета:

— 40 год я працаваў батраком у пана Савіцкага і атрымліваў мізэрную аплату. У 1939 годзе совецкая ўлада дала мне зямлю, вярнула мяне да жыцця. Але гэтае шчаслівае жыццё абарвалі нямецкія акупанты, і тры годы я зноў жыў жабраком, бяспраўным. Прышло вызваленне, і совецкая ўлада зноў падняла мяне на ногі, падзяліла зямлёй. Я зноў шчаслівы і бязмежна ўдзячны совецкай уладзе і асабіста таварышу Сталіну. Адпраўляючы свайго сына ў Чырвоную Армію, я даў яму наказ быць стойкім у баі, бязлітасна знішчаць немцаў.

Паспяхова праходзіць надзяленне сялян зямлёй у Жабінкаўскім і многіх іншых раёнах. Атрымліваючы зямлю, сяляне дзякуюць партыю і ўрад за тое, што яны далі ім магчымасць працаваць на сваёй зямлі, на карысць сабе і сваёй совецкай дзяржаве.

Надзяленне сялян зямлёй у радзе месц яшчэ не закончана. Цяпер, напярэдадні сяўбы, мы прымаем усе захады к таму, каб завяршыць гэтую адказную і благародную справу.

Вялікае месца ў падрыхтоўцы да сяўбы ў нас заняла арганізацыя дапамогі бясконным сялянскім гаспадаркам і ў першую чаргу сем'ям франтавікоў, інвалідаў Айчыннай вайны і партызан. У абласці каля 43 тысяч гаспадарак не маюць коней. Гэта абавязвае нас напружыць усе сілы для таго, каб не пакінуць незасеянымі палі сем'яў, якія найбольш пацярпелі ад акупантаў. Гэтае пытанне мы вырашаем як шляхам арганізацыі МТС і конна-пракатных станцый, так і шляхам максімальнага скарыстання цягла, якое ёсць у сялян. Да кожнай гаспадаркі, якая мае каня, мы прымацоўваем бясконныя гаспадаркі ў мэтах атрымання дапамогі па апрацоўцы палёў.

У большасці выпадкаў такое размеркаванне цяглавай сілы адбываецца па ініцыятыве саміх сялян. Так, напрыклад, сялянка Ксенія Зенчук (Маларыцкі раён) абавязалася дапамагчы ўзараць і засеяць яравыя сваёй суседцы, муж якой загінуў на фронце. Такія-ж абавязацельствы ўзялі на сябе сотні другіх палкіх патрыётаў совецкай Радзімы.

У радзе вёсак на апрацоўцы палёў будзе выкарыстана малапрадуктыўная буйная рагатая жывёла. Сяляне многіх вёсак (Параслянскі сельсавет, Пружанскага раёна, і другія) зрабілі ярмы і прывучаюць да работы кароў.

Вялікія цяжкасці сустрэліся пры рамонце сельскагаспадарчага інвентару. Нехапае кавалёў. Усё-ж і нямногія спецыялісты, якія ёсць у абласці, зрабілі вялікую справу. Лепшыя з іх, як 60-гадовы каваль Іван Грыгор'евіч Лукішчык і другія, працуюць дні і ночы. Нясныння працуюць кузні ў Матыкальскім і другіх сельсоветах Брэсцкага раёна. Апрача гэтага, мы мабілізоўваем усіх людзей, якія разумеюць кавальскую справу, ствараем спецыяльныя рамонтныя брыгады. З дапамогай іх мы спадзяемся закончыць рамонт інвентару і машын да пачатку сяўбы.

У мэтах дапамогі насенным матэрыялам сем'ям франтавікоў, інвалідаў Айчыннай вайны і партызан, а таксама гаспадаркам, якія вельмі пацярпелі ад акупантаў, у кожным сельсавеце ствараецца спецыяльны фонд. Сяляне ахвотна даюць для гэтых мэт збожжа, бульбу, грошы. Толькі ў Бытчанскім сельсавеце, Кобрынскага раёна, сабрана больш 24 тон збожжа, у Параслянскім сельсавеце, Пружанскага раёна,—19 тон збожжа і 8.684 рублі грашыма і г. д. Усяго па абласці ў фонд дапамогі паступіла каля тысячы тон збожжа.

Значна лепш абстаіць справа з падрыхтоўкай да сяўбы ў нашых калектыўных гаспадарках. Калгасы імені Сталіна і імені Молатава, Жабінкаўскага раёна, а таксама і другія нядаўна арганізаваныя арцелі выходзяць на сяўбу добра падрыхтаванымі.

Зразумела, нам прадстаіць яшчэ зрабіць вельмі многае, каб хутка і высокаякасна правесці сяўбу, каб заваяваць пяршынства ў соцыялістычным спаборніцтве з сялянамі Пінскай абласці. З гэтымі задачамі вызваленае сялянства Брэсцкай абласці справіцца.

С. СІКОРСКІ,
старшыня выканкома абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

УСЁ ДЛЯ ПЕРАМОГІ

З першых дзён вызвалення наш сельсавет разгарнуў работу па аднаўленню сельскай гаспадаркі.

Надыйшла веснавая сяўба. Сяляне нашага сельсавета далі слова, што і з гэтай задачай справяцца выдатна, засеюць усю зямлю, адведзеную пад яравыя пасевы. На чым-жа грунтуецца такая заява?

Закончыўшы нарыхтоўку лесу, мы адразу-ж пачалі актыўную падрыхтоўку да веснавых работ. Дэпутаты сельсавета і мясцовыя актывісты пайшлі на дварах і выявілі ўвесь інвентар і сельгасмашыны, якія патрабуюць рамонту. Адначасова была наладжана бесперабойная работа двух кузняў. Кавалі ўзорна спраўляюцца са сваёй работай. Праз два дні ўсе плугі, бораны і павозкі, якія патрабавалі рамонту, будуць гатовы да работы.

Адначасова з падрыхтоўкай да сяўбы мы правялі надзел былых батракоў і малазямельных сялян зямлёй і сенажацямі. 75 сялянскіх гаспадарак, якія ў годы панскай Польшчы, а затым у часы нямецкай акупацыі гібелі без хлеба, батрачылі, цяпер атрымалі зямлю, падымаюць на ногі сваю гаспадарку.

Не забываюць нашы сяляне і аб сем'ях франтавікоў і інвалідаў Айчыннай вайны. Для дапамогі ім сабрана 12 тон насення збожжавых, будзе таксама прадастаўлена цяглавая сіла.

Вялікі патрыятызм сялян, выкліканы новымі перамогамі гераічнай Чырвонай Арміі. Таму сяўбу мы правядзем хутка і высокаякасна, забяспечым высокі ўраджай, чым акажам вялікую дапамогу Чырвонай Арміі ў яе барацьбе за канчатковы разгром нямецкага фашызма.

П. КОЗЕЛ,
старшыня Матыкальскага сельсавета, Брэсцкага раёна.

Радзіма іх прытуліла

Да вайны сям'я Арцёма Шапавалава з вёскі Трыпіўкі, што на Суражчыне, жыла, як тысячы такіх сем'яў, шчаслівым, заможным жыццём. Арцём з жонкай добра працавалі ў калгасе і карысталіся вялікай павагай і пашанай сваіх аднасельчан. Жылі яны ў прасторнай, утульнай, светлай хаце, пад акном якой у кожную вясну ішлі кветкі. Як Арцём, так і яго жонка, вельмі любілі сваіх дзяцей, якіх тады ў іх было чацвёра.

Самая дарослая дванаццацігадовая Таня навучалася ў чацвертым класе, дзевяцігадовы Ваня—у другім, а васьмігадовы Лёня—у першым.

— Мы сапраўды шчаслівыя, — часам гаварыў Арцём сваёй жонцы. — Добрыя дзеці—вялікае шчасце! А галоўнае—нашы дзеці вучацца...

І Арцём пачынаў меркаваць аб тым, на каго ён вывучыць сваіх дзяцей. Дачку Таню ён марыў вывучыць на пастаўніцу. Ваню і Лёню—на камандзіраў Чырвонай Арміі, чатырохгадовага Колю — на інжынера. А самага маленькага Пецю Арцём меркаваў—у трактарысты.

— Самы меншы павінен жыць дома, з намі,—дадаваў ён.

Жоры калгасніка Арцёма—тэта благародныя мары ўсіх банькоў і маці нашай совецкай краіны.

... Распачалася вайна. Чорным груганём наляцелі немцы на нашу беларускую зямлю. Запалалі гарады і сёлы. На плошчах і на скрыжаваннях дарог выраслі шыбеніцы. Ядавітай вужакай падпаўзла гітлераўская зграя і да вёскі, дзе жыла сям'я Шапавалавых. Свінцовым агнём непакорлівая вёска сустрэла чужынцаў. У першых шэрагах патрыётаў стаў Шапавалаў Арцём. Ён—начальнік штаба атрада. Ён абараняў ад людаедаў-немцаў сваю сям'ю, сваю Радзіму.

Аднойчы ў жорсткай, няроўнай схватцы з карнікамі Арцём загінуў смерцю храбрых. Паміраючы, ён сказаў простыя словы:

— Паглядзіце за маімі дзеткамі...

Немцы дзікай зграяй уварваліся ў вёску Трыпіўкі. Запалалі новыя калгасныя хаты, ручаём палілася кроў нявінных дзяцей і жанчын. Арцёміха з сваімі малышамі цудам выратавалася. Зямлянка ў пёмным, густым лесе стала іх домам. Былыя таварышы загінуўшага камандзіра абаранілі іх жыццё.

Арцёміха была маці, маці пяцёх дзяцей. Яна стала воінам—партызанам. Яна помсціла за мужа, за разбураны сямейны ачаг. І калі аднойчы Марына трапіла ў лапы немцаў, яна цвёрда сказала:

— У мяне вы нічога не пытайце. Я вам нічога не скажу.

Яе білі, катавалі. Спіскаючы ад страшэннага болю зубы, яна маўчала. Немец выпусціў аўтаматную чаргу. Марына ўпала ніц.

— Бывайце, дзеткі мае,—вымавіла яна. І моўчкі памерла...

Так дзеці Шапавалавых сталі сіротамі.

Бацькоўскімі клопатамі акружылі іх партызаны: прыносілі хлеб, бульбу, малако. Самая дарослая Таня стала гаспадыняй: гатавала ежу, шыла, мыла, латала бялізну, забаўляла малых.

Аднойчы ноччу, малыя прачнуліся ад моцнай страляніны. Захлёбваючыся, гаварылі кулямёты. Ад разрываў снарадаў дрыжэла зямля.

— Немцы, зноў немцы,—тулячыся да Тані, заплакаў трохгадовы Пеця.

— Не плач, Пеця, гэта не немцы. Гэта нашы ідуць. Камандзір атрада гаварыў, што нашы блізка,—супакойвала Таня.

І сапраўды, у той-жа дзень зранку тут паявіліся новыя людзі.

Ваня выбег за дзверы і ўбачыў людзей у вайсковай форме. Плёскаючы ў далоні, ён закрычаў:

— Таня, нашы прышлі!...

* * *

Усю гэтую гісторыю расказала нам Таня Шапавалава, якую мы сустрэлі ў Віцебскім дзіцячым доме. Жыве яна тут ужо больш поўгода. Вучыцца ў школе, вучыцца кравецкай справе. Гэта ружовашчокая, не па гадах узмужалая дзяўчынка расказала нам і аб далейшым лёсе іх сям'і.

Трынаццацігадовы Ваня і дванаццацігадовы Лёня таксама выхоўваюцца ў Лёзнянскім дзіцячым доме, сямігадовы Коля—у Багушэўскім дзетдоме.

Таня дастала з скрынкі некалькі пісем і саматліва працягнула нам пісьмо ад Вані. Ён піша: «Дарагая сястрычка! Як я ужо раней пісаў табе, жыву я з Лёнем добра. Кормяць нас смачна. Выхавацельніцы шкадуюць нас. Я вучуся ў трэцім класе, а Лёня—у другім. Мы маем адзнакі 5 і 4. У нас ёсць майстэрня. Мы робім там розныя рэчы. Я з таварышам змайстравалі лямпу. Гэта праца мне вельмі падабаецца. Як падрасту, я, напэўна, буду тэхнікам. А Лёнька, як і раней, думае стаць камандзірам Чырвонай Арміі. Няхай сабе будзе камандзірам. Нашы, дарагая сястрычка, што чутна аб нашых малышах Пеці і Каці. Пішы мне. З прывітаннем твой родны брат Ваня».

— Пеці зараз чатыры гады,—тлумачыць Таня,—ён жыве ў Сіроцінскім раёне ў цёткі Елізаветы. Яе дачку расстралялі немцы, дык яна ўзяла Пецю за сына. Я хацела яго забраць да сябе ў дзетдом, а цёця Елізавета не дае,—дадае Таня і падае нам другое пісьмо.

— Гэта ад Анны Іванаўны.

Анна Іванаўна—выхавацельніца Смалоўскага дзетдома (Віцебская вобласць), дзе выхоўваецца самая маленькая з сям'і Шапавалавых—Каця, у сваім пісьме піша: «Танечка! Ты пытаеш, як жыве твая сястрычка? Жыве яна і распе, як грыб пасля дажджу. На тры кілограмы прыбавілася ў вазе. У яе выраслі пярэднія зубкі. Яна навучылася хадзіць і называе мяне «мама». Адным словам, вельмі цікавая дзяўчынка-партызанка. Так мы завём яе, бо яна парадзілася ў лесе, у партызанскім атрадзе»...

Дзеці, бацькі якіх загінулі ад рук гітлераўскіх бандытаў, не засталіся беспрытульнымі. Іх прыгрэла, прытуліла маці-Радзіма.

С. СВІРЫДАЎ.

Дзень Бабруйска

ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ АГАРОДЫ ПРАЦОЎНЫХ

Заканчваецца падрыхтоўка да сяўбы ў падсобных гаспадарках і на індывідуальных агародах рабочых і служачых. Выдзелены зямельныя ўчасткі, на якія вывозіцца ўгнаенне. Трэст «Зеленгас» заклаў звыш 200 парніковых рам, у якіх высад жана расада.

У бліжэйшы час у горадзе будуць адкрыты тры ларкі, дзе прапоўныя зможуць атрымаць насенне і расаду для сваіх індывідуальных агародаў.

АЗЕЛЯНЕННЕ ГОРАДА

З наступленнем веснавых дзён разгарнулася работа па ачыстны гарадскіх сквераў і садоў, праводзіцца падрэзка дрэў.

У аранжарэях вырашчваецца расада кветак. У гэту вясну на вуліцах горада будзе пасаджана больш тысячы дэкаратыўных дрэў і зроблены сотні квесткавых клумб.

ШКОЛА СТАРШЫХ ПІОНЕРВАЖАТЫХ

Пры гаркоме комсамола пачала работу школа старшых піонерважатых. У ёй займаюцца піонерважатыя 18 гарадскіх школ. Курсанты праслухаюць рад лекцый па палітычных тэмы, а таксама па педагогіцы.

ДЫСПУТ АБ АПОВЕСЦІ «ГОРДЫ ЧАЛАВЕК».

У чытальным зале Дома Чырвонай Арміі адбыўся літаратурны дыспут аб аповесці пісьменніка Сіманава «Горды чалавек». Удзельнікі літаратурна-мастацкага дыспуту адзначылі вялікае грамадскае значэнне тэмы аб героях фронта і тылу.

Ш�эФСТВА НАД ШПІТАЛЯМІ

Працоўныя горада ўзялі шэфства над адным з шпіталяў. Яны сабралі і адправілі звыш 200 пасылак для раненых байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі. Калектыў лесакамбіната выдзеліў спецыяльную брыгаду рабочых, якая абсталявала для шпіталя клуб і некалькі палат. Гурток мастацкай самадзейнасці мэблевай фабрыкі імені Халтурына даў у шпіталі канцэрт.

(БЕЛТА).

БУДАЎНІЦТВА ТОРФАБРЫКЕТНЫХ ЗАВОДАЎ У БЕЛАРУСІ

Перад вайной у Беларусі пачалося будаўніцтва чатырох торфабрыкетных заводаў вытворчай магутнасцю ў 50 тысяч тон брыкета ў год кожны. Фашысцкія бандыты разбурылі ўсе брыкетныя заводы, а абсталяванне вывезлі ў Германію.

Тарфянікі мястэчка Смалявічы першымі ў рэспубліцы адналі будаўніцтва малога торфабрыкетнага завода. Яны шырока скарысталі мясцовыя будаўнічыя матэрыялы, у прыватнасці, па месцы арганізавалі здабычу вапны.

Пры Наркамаце мясцовай паліўнай прамысловасці БССР створана Галоўнае ўпраўленне па новабудоўлях, якому даручана ў 1945 годзе пабудаваць 5 малых торфабрыкетных заводаў. Па месцы намечаных да будаўніцтва аб'ектаў пачаліся работы па выяўленню сыравінных баз, разгарнулася нарыхтоўка і падвоз лесу да будаўнічых пляцовак. Новыя заводы будуць створаны на тарфяных масівах Мінскай, Віцебскай, Гомельскай і іншых абласцей рэспублікі. (БЕЛТА).

ІНСТЫТУТЫ УДАСКАНАЛЕННЯ НАСТАЎНІКАЎ

Пры 11 абласных аддзелах народнай асветы створаны інстытуты ўдасканалення настаўнікаў. Арганізоўваецца таксама інстытут пры Полацкім аддзеле.

Задача інстытутаў—павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў, кіраўнікоў школ, раённых і гарадскіх аддзелаў асветы і перадача перадавога вопыту работы лепшых настаўнікаў усім школам.

Інстытуты будуць аказваць сістэматычную дапамогу раённым і гарадскім педагагічным кабінетам і метадычным аб'еднанням у справе арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі. Інстытуты ўкамплектоўваюцца лепшымі кадрамі, вопытнымі педагогамі-метадыстамі. Усю сваю работу інстытуты праводзяць шляхам пісьмовай, вуснай, індывідуальнай і групавой кансультацый, лекцый, дакладаў і гутарак.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 28 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што, маркуючы па наяўных прызнаках, жорсткае супраціўленне немцаў у паўночным сектары ніжнерэйнскага плацдарма саюзнікаў аслабявае. Войскі саюзнікаў фарсіравалі раку Ісель, уступілі ў Дынгдэн і занялі 5 іншых гарадоў. Саюзнікі знаходзяцца ў 1 кілометры ад Рурскай аўтамагістралі.

У Паўночным сектары плацдарма, які размешчан на ўсходзе ад Рэмагена, саюзнікі сустракаюць жорсткае супраціўленне па ўчастку ўздоўж ракі Зіг. У іншых пунктах саюзныя часці прадаўжалі хутка прасоўвацца ўглыб Германіі. Танкавыя часці, якія прасунуліся на ўсход на 43 кілометры, дасягнулі ваколіц Херборна. На поўдні танкавыя часці прайшлі 22,5 кілометра і дасягнулі прадмесцяў Вейльбурга (у 16 кілометрах па паўночным усходзе ад Лімбурга). Рака Лан фарсіравана ў раёне Аумепау (у 16 кілометрах на ўсходзе ад Лімбурга). Пяхотныя часці, якія следуюць за танкамі, ачысцілі Лімбург. Танкавыя часці, якія прасоўваюцца ўздоўж аўтамагістралі, што вядзе на паўдзённы ўсход, дасягнулі пункта у 8 кілометрах ад Вісбадэна.

Танкавыя часці саюзнікаў, якія пераправіліся праз раку Майн, вядуць баі ў Франкфурце-на-Майне. Ачышчаны тры прадмесці горада.

У раёне плацдарма паблізу Вормса саюзныя часці прасунуліся на ўсход на адлегласці да 15,5 кілометра, ачысцілі рад населеных пунктаў і перасеклі аўтамагістраль, якая ідзе ў гэтым раёне з поўначы на поўдзень.

За 26 сакавіка войскі саюзнікаў на заходнім фронце ўзялі ў палон 19.712 чалавек.

* * *

ЛОНДАН, 29 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што войскі саюзнікаў паспяхова прасунуліся ва ўсіх сектарах ад прадмостнага ўмацавання па Рэйне, на поўначы ад Рура. На поўначы ад Рэсса войскі саюзнікаў дасягнулі прадмесця Эмерыха і занялі Іссельбург. Далей на ўсходзе саюзнікі хутка прасунуліся ўперад у той частцы Дорстэна, якая знаходзіцца на поўначы ад канала Ліпе. На поўдні ад гэтага канала саюзнікі занялі 3 гарады.

Далей на поўдні танкавыя часці саюзнікаў, якія прасоўваюцца ва ўсходнім напрамку, уступілі ў Гісен. у 104 кілометрах на ўсходзе ад Рэйна, і ў Белінгаузен, прыкладна ў 13 кілометрах па поўначы ад Гісена. Адзін з атрадаў дасягнуў прадмесця Ліх, які знаходзіцца прыкладна ў 10 кілометрах на паўднёвым усходзе ад Гісена, прасунуўшыся прыкладна на 43 кілометры. На паўднёвым захадзе ад Гісена занят Вейльбург. Танкавыя атрады саюзнікаў пераправіліся праз раку Лан у двух пунктах.

Часці саюзнікаў, якія пераправіліся праз раку Рэйн па ўсходзе ад Бінарда, дасягнулі прадмесця Генсталя, у 16 кілометрах на паўночным захадзе ад Вісбадэна. Далей па поўдні войскі саюзнікаў фарсіравалі Рэйн яшчэ ў адным пункце, ачысцілі ад праціўніка 3 гарады і ўступілі ў Вісбадэн. Пяхотныя і танкавыя атрады саюзнікаў ачысцілі палавіну Франкфурта-на-Майне, пераадольваючы ўпорнае супраціўленне ворага. Ханау і Ашафенбург, якія размешчаны далей па ўсходзе, ачышчаны ад праціўніка. На поўначы ад Ханау танкавыя атрады саюзнікаў дасягнулі прадмесця Нідэрфлорштадт, прыкладна ў 10 кілометрах да паўднёвым усходзе ад Бад-Наўгейма.

Саюзнікі прадаўжалі расшыраць сваё прадмостнае ўмацаванне ў раёне Дармштадт і Мангейм. Пяпер гэтае прадмостнае ўмацаванне займае плошчу звыш 500 квадратных кілометраў. Захоплена ў поўнай спраўнасці некалькі мастоў праз Рэйн. Саюзныя часці, якія прасоўваюцца ад гэтага прадмостнага ўмацавання, дасягнулі Нідэрнберга на рацэ Майн, на поўдні ад Ашафенбурга, заняўшы Гросумштадт.

У раёне Одэнвальда прасоўванне саюзнікаў было больш павольным, але тым не менш яны занялі каля 20 гарадоў. Ачышчана ад праціўніка паўночная палавіна Мангейма.

27 сакавіка войскі саюзнікаў узялі на заходнім фронце 17.039 палонных.

НАЛЕТ НА БЕРЛІН І ГАНАВЕР

ЛОНДАН, 28 сакавіка. (ТАСС). У афіцыяльным паведамленні штаба амерыканскіх стратэгічных ваенна-павітраных сіл у Францыі гаворыцца, што раніцай 28 сакавіка звыш 950 бамбардыроўшчыкаў у суправаджэнні больш 350 знішчальнікаў зрабілі налёт на германскія ваенныя заводы ў Берліне і Ганаверы.

ПАСЛАННЕ РУЗВЕЛЬТА КАНГРЭСУ

ВАШЫНГТОН, 26 сакавіка. (ТАСС). (Затрымана дастаўкай). У пасланні кангрэсу прэзідэнт Рузвельт рэкамендуе адабрыць удзел Злучаных Штатаў у міжнародній арганізацыі па пытаннях харчавання і сельскай гаспадаркі і адобрыць статут, які падрыхтаван часовай камісіяй.

ДАКУМЕНТЫ, ЗНОЙДЗЕНЫЯ У ВЕНГЕРСКІМ ГЕСТАПА

ДЭБРЭЦЭН, 29 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе газета «Небсава», у рукі будапешцкай паліцыі трапілі дакументы венгерскага гестапа, які змяшчаўся на гары Шваб (Швабхедзь). У адной з папак з надпісам «сакрэтна» выяўлены спісы, дакладныя даныя і фатаграфіі членаў совецкай місіі, якія адносяцца да 1940 года. Усе супрацоўнікі місіі, ад пасланніка да кухаркі, былі пад наглядам агентаў гестапа. Пяць агентаў хадзілі па пятах рускіх дыпламатаў у той час, як урадавыя газеты ўсялякі выхвалялі Совецкі Саюз.

Матэрыялы сведчаць аб тым, што агенты гестапа сачылі не толькі за дзейнасцю дыпламатаў і палітыкаў, але таксама за пісьменнікамі і другімі дзеячамі літаратуры і мастацтва. Вядома таксама, што венгерскія гестапаўцы, уцякаючы з Будапешта, укралі 2 мільёны пенго дзяржаўных грошай.

АРЫШТ ВАЙДА-ВОЙВОДЫ

БУХАРЭСТ, 29 сакавіка. (ТАСС). Газеты «Ромыніа лібера» і «Скынтэйя» паведамілі ўчора пра арышт у Сібіу Вайда-Войводы, былога прэм'ер-міністра, арганізатара жалезнай гвардыі (румынская фашысцкая арганізацыя) і забойцу рабочых-чыгуначнікаў у Грывіцы ў 1933 годзе.

ЗАЯВА БЕЛАГА ДОМА

ЛОНДАН, 27 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне карэспандэнта газеты «Дэйлі Мейл» з Нью-Йорка, у якім гаворыцца: прэзідэнт Рузвельт аддаў сёння распараджэнне членам свайго кабінета і ўсім дыпламатычным прадстаўнікам знаходзіцца напагатове на выпадак неадкладнай перамогі ў Еўропе. Белы Дом паведаміў, што прэзідэнт прапанаваў усім дыпламатычным прадстаўнікам аставацца на сваіх пастах у Еўропе з тым, каб быць гатовым дзейнічаць у выпадку якой-небудзь надзвычайнай падзеі або хуткага краху Германіі. Рузвельт заклікаў таксама ўсіх членаў урада быць напагатове ў Вашынгтоне, аставацца на сваіх пастах і не праектыраваць паездку на канферэнцыю Аб'еднаных Нацый, якая пачнецца 25 красавіка ў Сан-Францыска.

Адначасова прэзідэнт заявіў, што амерыканская дэлегацыя на канферэнцыі ў Сан-Францыска павінна звесці да мінімуму колькасць сваіх советнікаў. Аб гэтым паведаміў сакратар Белага Дома Джонатан Даніэльс, які ўказаў, што крок прэзідэнта ставіць дзве мэты — утрымаць асноўных афіцыяльных асоб на сваіх пастах у крытычныя дні і пазбегнуць лішняга скаплення людзей на транспарце і ў аэлях Сан-Францыска. На пытанне аб тым, калі прэзідэнт мяркуе паехаць у Сан-Францыска і ці збіраецца ён гэта зрабіць, Даніэльс заявіў, што ён нічога не ведае па гэтаму пытанню. Раней Рузвельт публічна аб'явіў, што ён мае намер наведаць канферэнцыю і звярнуцца з прамовай да дэлегатаў.

ПОСПЕХ КАМПАНІІ «УСЁ ДЛЯ ФРОНТА» У РУМЫНІІ

БУХАРЭСТ, 29 сакавіка. (ТАСС). Паводле паведамлення газеты «Скынтэйя» рабочыя вугальнага раёна ў Альба-Юлія з энтузіязмам адгукнуліся на заклік усеагульнай канфедэрацыі працы Румыніі і перадалі ў фонд дапамогі фронту 14 мільёнаў лей, зароблены за 8 гадзін. Газета публікуе велізарныя спісы гандлёвых прадпрыемстваў, якія ўнеслі грашовыя сродкі ў фонд «Усё для фронта».

ХВАЛЯВАННІ Ў НЯМЕЦКІХ ВОІНСКІХ ЧАСЦЯХ У ДАНІІ

ГЕТЭБОРГ, 29 сакавіка. (ТАСС). Згодна атрыманых тут вестак, у апошні час у нямецкіх воінскіх часцях у Даніі мелі месца шматлікія спробы бунту. Вечарам 25 сакавіка і ў ноч на 26 сакавіка ў Копенгагене адбываліся перастрэлкі і сутычкі паміж бунтуючымі часцямі і эсэсаўцамі. У раёне нямецкіх казарм па бунтаўшчыках быў нават адкрыт агонь з лёгкіх гармат. На адной з плошчаў адбыўся бой паміж нямецкай палявой паліцыяй і армейскімі часцямі.

ГІТЛЕРАЎЦЫ ХАВАЮЦЦА У ШВЕЙЦАРЫІ

ЛОНДАН, 29 сакавіка. (ТАСС). Лонданскае радыё паведамляе, што гэтымі днямі цюрыхскі часопіс «Тат» змясціў артыкул аб бегстве ў Швейцарыю чыноў нямецкай пагранічнай аховы і паліцэйскіх. Часопіс адводзіць цэлую старонку фотаздымкам, якія паказваюць прыбыццё гітлераўцаў на швейцарскую граніцу. Аўтар артыкула піша, што да паяздоў, якія следуюць з Германіі ў Швейцарыю, некалькі разоў у тыдзень прычапляецца спецыяльны санітарны вагон. Пасля прыбыцця такога поезда на аўстра-швейцарскую пагранічную станцыю Санкт-Маргарэтэн «хворых» з нямецкага поезда пераносяць на швейцарскі і адпраўляюць у адзін з пятнаццаці нямецкіх санаторыяў у Швейцарыі. «Тат» піша, што ў гэтых хворых «падазрона здаровы выгляд». Часопіс адкрыта дадае: «Гэта — бясспрэчна адзін са спосабаў, які аблягчае бегства нацыстаў з Германіі».

АДКАЗЫ КОЙСО НА ЗАПЫТАННІ Ў ПАРЛАМЕНЦЕ

ТОКІО, (ТАСС). На паседжанні бюджэтнай камісіі ніжняй палаты 22 сакавіка Макіно запытаў, якіх вынікаў дасягнуў урад з моманту яго фарміравання? Ці не трэба ўраду змяніць сваю палітыку і пачаць усё спачатку?

Прэм'ер Койсо адказаў: «З моманту фарміравання кабінета народ выхоўваўся ў духу, адпавядаючым мэтам вайны, але зараз нельга адмовіць таго, што дух народа аслабеў. Што датычыць вытворчасці, то адзін час яна знізілася, але зараз аднаўляецца даваенны ўзровень».

Далей на ўказанне Макіно аб тым, што народ схілен да песімістычнай ацэнкі ходу ваенных падзей, што гэта адбываецца з-за недахопаў у палітыцы і што ўрад павінен па магчымасці інфарміраваць народ аб сапраўдным становішчы спраў, Койсо адказаў: «Урад згодзен з неабходнасцю інфарміраваць народ аб сапраўдных стратах у выніку бамбардыровак, так што ў будучым урад прыме адпаведныя крокі ў гэтым напрамку. Тым не менш, такая інфармацыя аб сапраўднай абстаноўцы можа паслужыць на-руку ворагу і перашкодзіць канцэнтрацыі магутнасці краіны».

Далей Макіно запытаў аб магчымасці падтрымання супакою і парадку ў краіне. Койсо адказаў, што з інтэнсіфікацыяй вайны спакой і парадак унутры краіны могуць быць нарушаны, аднак урад прадпрыме ўсе захады з мэтай забяспечання парадку.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

Французскі міністр фінансаў Плевен і англійскі міністр фінансаў Андэрсон падпісалі фінансавае пагадненне. Гэтае пагадненне стварае фінансавую базу, неабходную для аднаўлення і развіцця гандлёвага абмену паміж Англіяй і Францыяй.

* * *

У Рыме арыштаван вядомы італьянскі прафашысцкі адвакат Бруно Касінелі. Ён абвінавачваецца ў супрацоўніцтве з ворагам і прыналежнасці да італа-фашысцкай тайнай паліцыі.

* * *

На белградскім заводзе «Сарцід» аднаўлена і ўступіла ў строй першая на вызваленай тэрыторыі Югаславіі мартэнаўская печ.

* * *

Амерыканская артылерыя патапіла ў гавані Лорыана (атлантычнае ўзбярэжжа Францыі) германскае судно водазмяшчэннем у 7 тысяч тон. Судно прабавала даставіць прадукты харчавання і боепрыпасы асаджанаму ў гэтым парту германскаму гарнізону.

* * *

У Кракаве адкрыт і пачаў сваю работу універсітэт.

(ТАСС).

ПАВЕДАМЛЕННЕ

31 сакавіка, у 19 гадзін, у Доме партыйнай асветы (вялікі зал) адбудзецца інструктыўны даклад для дакладчыкаў, кіраўнікоў гурткоў і агіткалектываў на тэму: «Ваенна-палітычнае і міжнароднае становішча Совецкага Саюза».

Дакладчык — дацэнт Ефімаў.

Дом партасветы.

Адказны рэдактар В. САМУЦІН.

Сёння ў тэатрах і кіно:

Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета
У памяшканні Дома Чырвонай Арміі
«МАДАМ БЕТЭРФЛЕЙ»
(Чыо-Чыо-Сан)
Пачатак у 19 гадзін 30 мінут.

Кінотэатр «Першы»
Для школьнікаў
«ДЖУНГЛІ»
Пачатак сеансаў у 10 і 12 гадзін.
Для дарослых
«РОДНЫЯ ПАЛІ»
Пачатак сеансаў у 14, 16, 18, 20 і 22 гадзіны.

Кінотэатр «Беларусь»
Для школьнікаў
«ЧАПАЕЎ»
Пачатак сеансаў у 10 і 12 гадзін.
Для дарослых
«ДЗЯЎЧЫНА СПЯШАЕЦЦА НА СПАТКАННЕ»
Пачатак сеансаў у 14, 16, 18, 20 і 22 гадзіны.

Кінотэатр «Радзіма»
«ПАДКІДЫШ»
Пачатак сеансаў у 20 і 22 гадзіны.
Дзіцячы кінотэатр
«СЕМЕРА СМЕЛЫХ»
Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16 і 18 гадзін.

БЕЛАРУСКАЯ
дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія
У памяшканні Акруговага Дома Чырвонай Арміі
2, 3 і 4 КРАСАВІКА
КАНЦЭРТЫ
ЭСТРАДНА-МЕЛАДЫЧНАГА АНСАМБЛЯ ПАД МАСТАЦКІМ КІРАЎНІЦТВАМ Б. В. ГРАДСКАГА (Ленінград).
ПРЫ ЎДЗЕЛЕ:
ЛЕАНІД РАБІНСКІ (юмар, сатыра);
НАДЗЕЖДА БАХ (арыі з аперэт і жанравыя песні);
ФАІНА КОКОІНА (балет, класічныя, х ара ктэрныя танцы);
КЛЕАПАТРА ЗІМІНА (старынныя рамансы і табарныя песні);
ПАВЕЛ ГУЦІН (рытмічныя танцы).
Пачатак у 20 гадзін. Білеты ў касе А.Д.Ч.А. з 14 гадзін.

Дырэкцыя мінскага педагагічнага інстытута імені Горкага
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА
СТУДЭНТАЎ-ВЫПУСКНІКОЎ ІНСТЫТУТА 1941 г.,
што, згодна растлумачэння ВКВШ,
ЯНЫ МОГУЦЬ АТРЫМАЦЬ ДЫПЛОМЫ АБ СКАНЧЭННІ ІНСТЫТУТА ПРЫ УМОВЕ ЗДАЧЫ УСІХ ДЗЯРЖЭКЗАМЕНАЎ.
УСЕ ВЫПУСКНІКІ 1941 г., ЯКІЯ НЕ ПОЎНАСЦЮ ЗДАЛІ ДЗЯРЖЭКЗАМЕНЫ, МОГУЦЬ ЗДАЦЬ ІХ У ПЕРЫЯД РАБОТЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ КАМІСІІ З 15 ЧЭРВЕНЯ ПА 15 ЛІПЕНЯ 1945 г.
Жадаючыя здаваць дзяржэкзамен павінны паведаміць аб гэтым дырэкцыі інстытута.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ
інвентарызацыйна-тэхнічнае ўпраўленне Наркомгаса БССР
ПРАДАЎЖАЕ НАБОР НА КУРСЫ
ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ТЭХНІКАЎ ПА ТЭХНІЧНАМУ УЛІКУ ЖЫЛЛЕВА-КОМУНАЛЬНАГА ФОНДА І ЗЕМЛЯЎ У ГАРАДАХ І РАЕННЫХ ЦЭНТРАХ БССР.
На курсы прымаюцца асобы абодвух полаў з адукацыяй не ніжэй 7 класаў.
Курсанты забяспечваюцца кватэрнымі і снабжэннем па норме рабочых.
Да заявы трэба прыкласці: даведку аб адукацыі, месцы працы і кароткую аўтабіяграфію.
ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА ПА АДРАСУ: г. Мінск, Дом урада, 4-ы паверх, пакой № 427, Цэнтральнае інвентарызацыйна-тэхнічнае ўпраўленне.

Да ўвагі грамадзян!
АШЧАДНЫЯ КАСЫ
ПРЫМАЮЦЬ і ВЫДАЮЦЬ УКЛАДЫ ДА ПАТРАБАВАННЯ, з выплатай 3 процантаў гадавых;
ПРЫМАЮЦЬ ТЭРМІНОВЫЯ ЎКЛАДЫ, па якіх выплачваюць даход 5 процантаў гадавых;
ПРЫМАЮЦЬ ВЫЙГРЫШНЫЯ ЎКЛАДЫ, з выплатай даходаў укладчыкам па іх укладах у выглядзе выйгрышаў;
ВЫДАЮЦЬ і АПЛАЧВАЮЦЬ АКРЭДЫТЫВЫ;
ПРЫМАЮЦЬ ДА ВЫКАНАННЯ АД УКЛАДЧЫКАЎ распараджэнні аб пераводзе іх укладаў у іншыя ашчадкасы, а таксама ВЫПЛАЧВАЮЦЬ УКЛАДЧЫКАМ пераводы ўкладаў, якія паступілі з іншых ашчадкас;
ВЫПЛАЧВАЮЦЬ ВЫЙГРЫШЫ па аблігацыях дзяржаўных пазык і білетах грашова-рэчавай латарэі;
ПРАВЯРАЮЦЬ АБЛІГАЦЫІ дзяржаўных пазык па тыражных табліцах.
УКЛАДЫ, УНЕСЕНЫЯ Ў АШЧАДНЫЯ КАСЫ, выдаюцца ўкладчыкам па іх патрабаванню часткова або поўнасцю.
Тайна і недатыкальнасць укладаў гарантыруюцца законам.
Карыстайцеся паслугамі ашчадных кас!
Упраўленне дзяржпрацашчадкас і дзяржкрэдыта Беларускай ССР.